

СЕНАТАРЫ І ЧЫТАЧЫ: ПРА ВЫБАРЫ І НЕ ТОЛЬКІ

САМЫЯ ЗАГАДКАВЫЯ ТВОРЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ 11




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ЛЮТАГА 2024 г.
СЕРАДА
№ 31 (30165)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## КОРАТКА

- Замежныя інвестары ў 2023 годзе ўклалі ў эканоміку Беларусі $7,7 млрд.
- **Выстава BUDEXPO-2024 расчыніць свае дзверы 27—29 сакавіка.**



- Сучасны дзіцячы садок на 230 месцаў з басейнам адкрылі ў Бабруйску.
- **БУТБ плануе нададзіць пастаўкі беларускай сельгаспрадукцыі ў Нігерыю.**
- Дзяржінспекцыя адзначае рост выпадкаў масавай гібелі карася сярэбранага.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ПЯРЦОЎ, міністр інфармацыі:**

*«Выкарыстанне сучасных гаджэтаў, у тым ліку тэлефонаў і камп'ютараў, аказвае пэўнае ўздзеянне на чалавека. Сацыяльныя сеткі, напрыклад, здольныя фарміраваць светапогляд, светаадчуванне і ўплываць на рашэнні людзей. Каб нам максімальна эфектыўна і станоўча для будучыні нашай краіны, нашых дзяцей працаваць перыяд электаральнай кампаніі, трэба знаходзіць дзейсныя каналы камунікацый, уплыву і інфармавання нашых людзей, каб дастукацца да іх сэрцаў і душ».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «САМАЕ ВАЖНАЕ — МЫ ЗАХАВАЛІ ПЕРАЕМНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ КЛАСІЧНАЙ АДУКАЦЫІ»

### Пытанні вышэйшай адукацыі абмеркавалі на найвышэйшым узроўні

**Стратэгічна важная дзяржаўная задача і асноўная мэта работы сістэмы адукацыі — падрыхтоўка і выхаванне высокаадукаваных і высокакваліфікаваных спецыялістаў для эканомікі і сацыяльнай сферы краіны. Праблемы і шляхі ўдасканалення сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй абмеркавалі ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з прадстаўнікамі Рэспубліканскага савета рэктараў. Размова атрымалася адкрытай і прынцыповай. Пры гэтым, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, тэма размовы ні для каго не стала сюрпрызам. Нарада з прадстаўнікамі Рэспубліканскага савета рэктараў неаднаразова анансавалася.**



Фота БелТА.

### ЦІ СТАЛА КОЛЬКАСЦЬ ЯКАСЦЮ?

«Пытанняў, пагадзіцеся, назапасілася дастаткова. І мы павінны выйсці з гэтай залы з выразным алгарытмам іх вырашэння. Я хацеў бы, каб вы прапанавалі гэты алгарытм і мы выйшлі з гэтай залы з прынятым рашэннем», — задаў тон нарады Прэзідэнт. Ён нагадаў, што ў 1990-х было зроблена немагчымае, каб захаваць навуковыя школы і кампетэнцыі па падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Бераглі кожную капейку, укладвалі ў сферу немалыя сродкі. І як вынік — колькасць вышэйшых навучальных устаноў вырасла з 33 да 50, а студэнтаў — у паўтара раза.

«На жаль, колькасць не стала якасцю. Аб гэтым мы таксама павінны пагаварыць», — заўважыў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што былі створаны ВНУ ў рэгіёнах. У 2004 годзе адкрыты ўніверсітэт у Баранавічах, у 2006 годзе — у Пінску. «Вышэйшая адукацыя стала яшчэ больш блізкай і даступнай у кожным кутку Беларусі. Прычым у перыяд, калі эканоміка толькі-толькі пачала аздараўляцца пасля фінансавага калапсу першых гадоў незалежнасці», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Але, па яго словах, сёння пытанне ў тым, наколькі гэтыя ўніверсітэты загружаныя, асабліва ў Баранавічах і Пінску. «Тады губернатары слёзна прасілі адкрыць гэтыя ВНУ для таго, каб на рэгіянальным узроўні рыхтаваць спецыялістаў. Які вынік?» — спытаў беларускі лідар.

Ён падкрэсліў, што тады быў не проста вызначаны стратэгічны прыярытэт дзяржаўнага развіцця, а стаў практыкай: «Усё прадугледзелі: умацавалі матэрыяльна-тэхнічную базу, абнавілі лабараторыі і навучальныя аўдыторыі, пабудавалі і працягваем будаваць новыя карпусы і інтэрнаты, абнаўляем старыя. Работы вядуцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (БДУ), БНТУ, БДУІР і іншых установах. Самае важнае — мы захавалі пераемнасць і якасць класічнай адукацыі. Была рызыка кінуцца ў рэформы і эксперыменты. Нас вельмі актыўна спрабавалі ўцягнуць у іх дзеячы разнастайных замежных фондаў. Гэта рабілася невыпадкова. І, давайце шчыра казаць, недзе мы туды ўступілі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Будзем шчырымі: савецкая вышэйшая школа дала свету геніяльныя адкрыцці, услаўленыя на ўвесь свет імёны. Тады атрыманыя ў нашых ВНУ веды былі на вагу золата. І цяпер у Беларусь едуць вучыцца, таму што мы захавалі найлепшыя савецкія традыцыі». Па словах кіраўніка дзяржавы, для нашай кампактнай краіны 30 тысяч студэнтаў з больш чым 100 краін свету — прыстойны паказчык. Экспарт адукацыйных паслуг за 2023 год склаў больш за 90 мільёнаў долараў. Гэта, па словах Прэзідэнта, таксама нядрэнна.

### ПРАГРАМА, ПАДРУЧНІКІ І ВЫКЛАДЧЫКІ

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што многія вострыя пытанні адукацыі вырашаны. Прыняты канчатковыя рашэнні па арганізацыі ўступнай кампаніі ў ВНУ, разабраліся са школьнай адукацыяй. У гэтай тэме паставілі кропку. Цяпер трэба дашліфаваць канкрэтныя падыходы. Менавіта на гэта і сарыентаваў удзельнікаў нарады Прэзідэнт.

«Сёння перад намі стаіць задача — ускалыхнуць ВНУ, адукацыю ў ВНУ, навуку ў ВНУ — усё, чым займаюцца ВНУ. Адразу хачу сказаць: да 1 верасня рэктары ВНУ павінны разам са сваімі калектывамі прыняць неабходныя рашэнні. Як вынік — якасныя выпускнікі і адсутнасць усялякіх уцёкаў за межы краіны. Вашы выпускнікі павінны дакладна разумець і ўсведамляць: наша адукацыя ў ВНУ — найлепшая. Многія, хто збег туды па адукацыю, хутка пачынаюць разумець розніцу. Многія вяртаюцца, але не ўсе. Гэтага хістання быць не павінна. А гэта праграмы, гэта выкладчыкі і якасны вынік. Як вы будзеце гэта рабіць — вашы праблемы. Але да верасня, папярэджваю ўрад, Адміністрацыю і міністра, мы, як па школе, збяромся і спытаем з кожнага», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў і асноўную для ўсіх задачу — наша моладзь павінна вучыцца і працаваць тут. «І спыняйце бегаць да мяне з нейкімі чарговымі навацыямі. Народ разброду і хістання ў адукацыі не прыме. Таму ціха, спакойна працуем у ВНУ, — падкрэсліў ён. — Яшчэ раз падкрэсліваю: праграма, падручнікі і выкладчыкі. І выходзіць нармальны, здаровы выпускнік, які можа працаваць у тых сферах вытворчасці, дзе ён марыў да паступлення».

СТАР. 2

Актуальна

# БЫЦЬ ПІЛЬНЫМІ ЗАЎСЁДЫ

### Як не трапіць прайдзісветам на вуду

**Імклівае развіццё лічбавых тэхналогій, але, у той жа час, часам недахват у людзей базавых навыкаў абароны асабістай інфармацыі ў інтэрнэце прывялі да ўстойлівага росту колькасці кіберзлачынстваў у нашай краіне. На жаль, сёння большасць грамадзян недастаткова інфармаваныя аб метадыцы дзеянняў такіх злачынцаў, а таму фармальна ставіцца да абароны ўласнай інфармацыі, персанальных даных, а, такім чынам, маёмасці.**

### «Алё, мама, дапамажы!»

**Начальнік упраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці ГУУС Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Дзмітрый СТАСЮЛЕВІЧ** адзначыў, што, як сведчыць практыка, канец 2023 — пачатак 2024 года характарызуюцца тым, што злачыннасць сыходзіць у бок здзяйснення ашуканскіх дзеянняў. Радзей пачалі рэгістравацца факты крадзяжу шляхам мадыфікацыі камп'ютарнай інфармацыі, але ў прынцыпе спосабы і метады здзяйснення злачынстваў застаюцца такімі ж, як і былі.

СТАР. 4



ISSN 1990 — 763X
24031

# «САМАЕ ВАЖНАЕ — МЫ ЗАХАВАЛІ ПЕРАЕМНАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз паўтарыў, што для сферы вышэйшай адукацыі зроблена шмат, створаны ўсе ўмовы. Навуковыя школы, інтэлектуальны патэнцыял зберагаюцца. «Таму мы ўсе: абітурыенты, студэнты, іх бацькі, нашы прадпрыемствы і арганізацыі, ды і я ў тым ліку, маем права чакаць аддачы», — канстатаваў ён.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што дэвіз Года якасці агучаны: мы павінны перасягнуць сябе, каб нармальна канкурыраваць на ўсіх рынках і выжыць. «Падымаем планку патрабаванняў да сябе і сапраўды прызнаём, дзе недапрацавалі», — сказаў ён. Гэта, безумоўна, адносіцца і да сферы вышэйшай адукацыі.

«Пытанні жыццё ставіць нам з вамі прынцыповыя і вострыя. Вы людзі разумныя, вучоныя са ступенямі, разумееце і меру сваёй адказнасці, і сутнасць гістарычнага моманту. Ведаеце, як важна не ўпусціць яго ў эпоху змены пакаленняў. Трэць стагоддзя таму нам удалося прайсці па краі бездані, не збочыўшы з дарогі, якую пракладалі нашы продкі. Паглядзіце на тых, хто збочыў, — на Прыбалтыку, Украіну і іншых. Загублены прамысловасць і сельская гаспадарка. Куды рыхтаваць кадры? Зразумела: для тых краін, на чые падачкі жывуць. Вось такая нацыянальная ідэя. Гэта не наш шлях», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў, што падчас яго нядаўняга візіту ва Узбекістан, падчас перагавораў неаднаразова ўзнімалася пытанне якаснай адукацыі. Паколькі разам з сучаснымі тэхналогіямі, для развіцця краіны неабходныя і кампетэнтныя кадры.

«Нам расслабляцца нельга ні ў якім разе і недаацэньваць выклікі сённяшняга дня», — звярнуў увагу беларускі лідар. Ён нагадаў, што ў жніўні мінулага года на нарадзе, прысвечанай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, быў абазначаны шэраг праблем вышэйшай адукацыі. Прайшло паўгода, і прыйшоў час акрэсліць, што зроблена для іх вырашэння. Аляксандр Лукашэнка канкрэтызаваў гэтыя праблемы.

## ПРАБЛЕМА ПЕРШАЯ. РАЗРЫЎ ПАМІЖ ПОПЫТАМ І ПРАПАНОВАЙ НА РЫНКУ ПРАЦЫ

«Крый вас бог рыхтаваць тое, што нам не патрэбна ў краіне. Мы быццам забыліся, як у 90-я пачалі рыхтаваць натоўпы юрыстаў, эканамістаў, якія, атрымаўшы дыплом, пайшлі працаваць таксістамі і разносчыкамі піцы. Ды і цяпер пасля заканчэння ВНУ многія выпускнікі працуюць не па профілі. Неаднаразова звяртаў увагу на гэтую тэму. Падрыхтоўка няпрофільных спецыялістаў, нізкая замацавальнасць на першым працоўным месцы, сыход з прафесіі — гэта недазвалальная раскоша для дзяржавы. Што, нам грошы няма куды траціць? А калі ўлічыць, колькі дзяржава плаціць, то што гэта, як не эканамічнае злачынства?» — заявіў Прэзідэнт.

Ён пацікавіўся, як рэктары могуць растлумачыць факты ўхілення ад адпрацоўкі, а яшчэ горш — «дагаварнякі» паміж наймальнікамі і ВНУ? Прычым на паперы не падкапаешся. «Дзе ваш кантроль? Атрымліваецца: выпусцілі і забыліся. Так справа не пойдзе. І нагадаю: вы не камерсанты — вы рэктары ВНУ і думаць абавязаны па-дзяржаўнаму. У першую чаргу вы павінны рыхтаваць кадры пад патрэбы айчыннага рэальнага сектара. Пакуль сістэмнай работы Мінэканомікі, Мінпрацы і Мінадукацыі, ды і губернатараў у гэтым пытанні не відаць», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, урад, як і іншыя адказныя, не стаў каардынатарам тых працэсаў, якія адбываюцца ў адукацыі.

## ДРУГАЯ ПРАБЛЕМА. ІМКНЕННЕ ВЫПУСКНІКОЎ АТРЫМАЦЬ ВЫШЭЙШУЮ АДУКАЦЫЮ ЗА МЯЖОЙ

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ёсць такая тэндэнцыя, не катастрафічная, але ёсць. «Што гэта — мода? Ці аб'ектыўны выбар?» — пацікавіўся ён. «Трэба разумець, што тыя, каго мы рыхтуем у ВНУ, — будучая эліта дзяржавы. Нашай дзяржавы. Як вы за іх змагаецеся? Канкрэтнае пытанне, на якое я хацеў бы пачуць канкрэтны адказ. Ведама, яны могуць вярнуцца, але з цалкам перавернутай свядомасцю. І чаму БДУ, БНТУ, медыцынскія ўніверсітэты ці БДУІР не з'яўляюцца для нашых студэнтаў-вундэркіндаў прыярытэтам для паступлення? Ці, можа, няма такой праблемы? Сацыялагічныя апытанні паказваюць, што ёсць», — сказаў беларускі лідар. Ён таксама пацікавіўся, як ВНУ працуюць са школамі, прэзентуюць сябе выпускнікам, узаемадзейнічаюць з прадпрыемствамі, якія павінны быць заказчыкамі кадраў. Аляксандр Лукашэнка спытаў, як адказныя асобы могуць растлумачыць дэфіцыт кадраў па запатрабаваных спецыяльнасцях. Па яго інфармацыі, мэтавая падрыхтоўка не вырашае праблему. «І для чаго мы стварылі столькі профільных класаў, калі менш за 39 працэнтаў выпускнікоў гэтых класаў паступае па профілі?» — задаў яшчэ адно пытанне кіраўнік дзяржавы.

Шмат праблем звязана і з вучэбнымі праграмамі ў ВНУ. Аляксандр Лукашэнка спытаў, ці своечасова яны абнаўляюцца. Ён пацікавіўся, ці ўкараняюцца найноўшыя тэхналогіі ў навучанне. «У мяне ёсць даныя: ледзь не палова студэнтаў сёння не задаволены якасцю адукацыі. Мы апыталі і старшакурснікаў, і першакурснікаў. Чым там займаецеся? Дакладваюць, што вы не паспяваеце за тэхналогіямі, малады спецыялісты давучваюцца на вытворчасці. А мы патрабуем у заказчыка гарантаваць першае працоўнае месца. Каму патрэбныя такія «спецыялісты»? — спытаў кіраўнік дзяржавы. — Але, з іншага боку, калі спецыялісты не адпавядаюць запытам заказчыкаў, то дзе іх удзел у працэсе навучання? Гэтых самых заказчыкаў. Чаму яны не прыходзяць у ВНУ і не вязуць сваіх будучых спецыялістаў да сябе? Чаму вытворцы самі не ідуць у аўдыторыі? Пытанні ўсім: рэктарам, галіновым міністэрствам, ураду».

## ТРЭЦЯЯ ПРАБЛЕМА. МОЛАДЗЬ НЕ НАДТА АХВОТНА ІДЗЕ Ў НАВУКУ І ВЫКЛАДАННЕ

«А мы пры гэтым яшчэ і дазваляем сабе раскідвацца высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Не думайце — звяртаюся да кіраўнікоў ВНУ, — што на ваш век хопіць выкладчыкаў», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым Прэзідэнт не выключае, што пры належным размеркаванні кадраў і пераўтварэнні навучальных праграм можна сустрэцца не з дэфіцытам кадраў, а наадварот, з незадзейнічанымі кадрамі. Па яго словах, у першую чаргу гэта найперш сфера адказнасці рэктараў ВНУ, якія павінны ініцыіраваць як абнаўленне праграм навучання, так і ўзмацніць патрабаванне з выкладчыкаў. «Калі выкладчыкі хочуць вялікую заработную плату, як на захадзе, значыць, і працаваць трэба як на захадзе — з ранку да ночы, асабліва моладзі, каб зарабіць», — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў сферы вышэйшай адукацыі трэба стварыць незалежную групу, якая б праверыла ВНУ, як гэта было зроблена ў ахове здароўя. Па яго словах, неабходна разварушыць ВНУ, якія «закасцянелі да неймавернасці». У першую чаргу Прэзідэнт запатрабаваў звярнуць увагу на змест і якасць праграм навучання і разгледзець магчымасць скарачэння часу падрыхтоўкі па асобных спецыяльнасцях: «Нам трэба дакладна паглядзець у ходзе работы гэтай рабочай групы, якія будуць праграмы і пад гэтыя праграмы — адпаведную адукацыю. Можа быць, не пяць гадоў недзе, не чатыры гады, а тры і чатыры гады».

Наступная праблема, якая апынулася ў полі зроку Прэзідэнта, — падручнікі. У прыклад ён прывёў падручнік па філасофіі, па якім вучыцца яго малодшы сын Мікалай. Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта жах. «Савецкія падручнікі давалі дакладныя структураваныя адказы на ўсе пытанні. А там такі хлам... Ні адзін студэнт гэта не вывучыць», — заўважыў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ён кожны год патрабуе прывесці падручнікі ў парадак, напісаць іх нармальнай мовай, зразумелай і даступнай для навучэнцаў.

«Мне дакладваюць, што прафесарска-выкладчыцкі склад старэе. Але праблема не ва ўзросце. Мы заўсёды беражліва ставімся да напрацаванага гадамі досведу і мудрасці. Дай бог многім сіл і здароўя як мага даўжэй дзяліцца сваімі ведамі з моладдзю, калі гэтыя веды ёсць і яны ўдасканальваюцца ў нашых мудрых выкладчыкаў. Не жоўтыя канспекты рукамі, якія трасуцца, трымаць на трыбуне, а нармальныя каб былі выкладчыкі, — выказаўся беларускі лідар. — Непакоіць іншае. Хацелася б бачыць годную змену. Заўтра пасля нас хто будзе? Асабліва па тых спецыяльнасцях, у якіх мае вострую патрэбу наша краіна сёння і ёсць перспектыва ў будучыні».

Прэзідэнт папярэдзіў, што пакуль не будзе новай методыкі, новых праграм і новых падручнікаў і выкладчыкаў, якія хочуць працаваць, аб высокай зарплаце не можа ісці гаворка. Па словах кіраўніка дзяржавы, галоўнае — гэта якасны вынік. «Спакойнага жыцця ў вас з гэтага дня не будзе. Пачынайце круціцца. Вы ведаеце самыя сучасныя ўзоры і ўзроўні адукацыі — зрабіце ў сябе лепей. Вось і Год якасці, — расставіў прыярытэты Аляксандр Лукашэнка. — Вядома, нельга сказаць, што сітуацыя крытычная, аднак па асобных кірунках, у першую чаргу тэхнічным, скажу шчыра, насцярожвае». Ён папярэдзіў, што рэктары сабраліся не дзеля справаздач, а для таго, каб унесці канкрэтныя прапановы па абазначаных праблемах. «Не павінна быць самазаспакоенасці. Нідзе не павінна быць самазаспакоенасці. Гэта датычыцца ўсіх», — канстатаваў Прэзідэнт. Таму, насцярожанасць па ўсіх пытаннях вышэйшай адукацыі вельмі сур'ёзная.

## ЧАЦВЁРТАЯ ПРАБЛЕМА. АДУКАЦЫЯ НЕ МОЖА БЫЦЬ ПА-ЗА ПАЛІТЫКАЙ

«Бачу па дакладах, што не ўсе ўразумелі маё прынцыповае патрабаванне да сістэмы адукацыі. Адукацыя ніколі не была і не можа быць па-за палітыкай. Вы не проста даяце прафесію — вы фарміруеце светапогляд маладых людзей. Скажу прама: вы першыя адказваеце за нацыянальную бяспеку і несяце адказнасць за захаванне суверэнітэту краіны. Калі згод вас да гэтага часу працуюць людзі, якія не падзяляюць нашы падыходы, нашу палітыку і дзяржаўную ідэалогію, калі вы працаўладкоўваеце ўчарашніх хісталь-нікаў «рэжыму», то якія высновы я павінен рабіць пра вас? Пытанне для разважання і прыняцця рашэнняў, — сказаў Прэзідэнт. — Гэта вашых студэнтаў, адурманеных заходнімі каштоўнасцямі, мы бачылі на плошчах у 2020-м. І многія сэнсы, якія іх вывелі на вуліцу, былі закладзены, на жаль, у вашых аўдыторыях. Ці не ў вашых і закладзены не вамі. Думаю, вы мяне пачулі».

## ПЯТАЯ ПРАБЛЕМА. НЕЗДАВАЛЬНЯЛЬНАЯ ІДЭАЛАГІЧНАЯ І ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА З МОЛАДДЗЮ

«Махровы бюракратызм. Усё для адчэпкі: і маладзёжныя арганізацыі, і прафсаюзы, і студэнцкія парады, і іншае!» — заўважыў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што ў сувязі з гэтым у яго шмат пытанняў да ўсіх: да ВНУ, Мінадукацыі, урада, Адміністрацыі Прэзідэнта, нашай маладзёжнай арганізацыі. І адразу даручэнне — спыніць фармалізм, бо, па словах кіраўніка дзяржавы, нікому нічога для птушачкі не трэба.

«Пра што казаць, калі асобныя выкладчыкі, мякка кажучы, самі не з'яўляюцца ўзорам патрыятызму. Што мы можам патрабаваць ад студэнтаў, калі, напрыклад, прафесар не можа ці не хоча кампетэнтна адказаць ім на складаныя жыццёвыя, палітычныя пытанні? У такой сітуацыі ніякія канцэрты, шоу-праграмы і іншыя флэшмобы не навучаць дзяцей шчыра любіць Радзіму, паважаць старэйшае пакаленне, берагчы гістарычную праўду», — заўважыў Прэзідэнт. Таксама, па яго словах, яскравых мерапрыемстваў, якія б сталі падзеяй і згуртавалі моладзь, не відаць, у першую чаргу на ўзроўні ВНУ.

Часта адказныя за сферу вышэйшай адукацыі займаюцца статыстыкай і самаспраўздачамі, як крытычна заўважыў кіраўнік дзяржавы. Напрыклад, міністр адукацыі Андрэй Іванец да гэтага часу не прапанаваў кандыдатуру на вакансію намесніка міністра па ідэалогіі, хоць яна была адкрыта па яго просьбе ў лістападзе 2023 года.

## ДА 1 ВЕРАСНЯ НЕАБХОДНА ВЫЗНАЧЫЦЦА

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што самаспраўздачы, самалюбаванне і «вялікія дасягненні» на гэтай нарадзе не патрэбныя. Савет рэктараў павінен прапанаваць далейшыя шляхі ўдасканалення нашай адукацыі. Шляхі развіцця іншых узроўняў адукацыі ўжо вызначаны. Наступіў час ВНУ. «Да 1 верасня мы павінны дакладна вызначыцца, што будзем рабіць. І, калі трэба (а хутчэй за ўсё, трэба будзе), сустрэнемся ў канцы жніўня пасля работы той камісіі, якая будзе створана і прашэрсціць усе ВНУ, паглядзіць, як і ў ахове здароўя. Мы падвядзём вынікі і зробім высновы, з кім далей будзем працаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што Савет рэктараў — гэта інтэлектуальны пул краіны: «У вашых руках сотні тысяч маладых людзей. За кожнага вы несяце адказнасць. Мной прынята рашэнне аб стварэнні Рэспубліканскага савета рэктараў з такімі паўнамоцтвамі шырокімі не для таго, каб ён пераўтвараўся ў нейкі дыскусійны фармальны клуб. Вы павінны былі стаць лакаматывам развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі».

## ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ ТРЭБА ІСЦІ АД ЖЫЦЦЯ

Сёння сістэма вышэйшай адукацыі прадстаўлена 49 ВНУ, у якіх навучаецца 230 тысяч студэнтаў і магістрантаў. Адукацыйны працэс забяспечвае больш за 17 тысяч выкладчыкаў. Універсітэты сёння рыхтуюць кадры для ўсіх галін эканомікі і сацыяльнай сферы. Аб прынятых мерах па павышэнні якасці вышэйшай адукацыі далажыў міністр адукацыі Андрэй Іванец.

Першае — сёння назіраецца сыход ад агульнай вышэйшай адукацыі. «Работу гэту мы пачынаем яшчэ са школы. Толькі за апошнія тры гады колькасць выпускнікоў дзявятых класаў, якія паступілі ў каледжы, вырасла з 30 да 50 %. Фактычна кожны другі выпускнік дзявятага класа выбірае траекторыю атрымання адукацыі ў каледжы. Гэта не гаворыць аб тым, што ім мы закрываем дарогу ў вышэйшую адукацыю. Ствараем адпаведныя дадатковыя траекторыі — толькі ў мінулым годзе ВНУ прынялі 10 тысяч выпускнікоў каледжаў», — расказаў міністр. Таксама, па яго словах, праводзіцца ранняя прафарыентацыя школьнікаў, у мінулым годзе вярнулі профільную падрыхтоўку ў восьмыя і дзявятыя класы. Развіваюцца і профільныя класы. Міністр адукацыі заўважыў, што працэнт паступлення пасля такіх класаў 20—30 працэнтаў, найбольш высокі вынік — у педагагічных класах. Па яго словах, гэтую работу трэба працягваць і па іншых профілях — аграрным, спартыўна-педагагічным. У гэтым годзе стварылі інжынерныя класы. Андрэй Іванец адзначыў, што без увагі не застаюцца школьнікі, якія вучацца ў базавых класах. Сёлета праходзяць працоўнае навучанне 30 тысяч школьнікаў на рабочых прафесіях, 90 працэнтаў з якіх атрымліваюць адпаведны дакумент і рабочую прафесію.

Міністр адукацыі расказаў, што яго турбуе лічба восем тысяч. Менавіта столькі студэнтаў кожны год адлічваюць з ВНУ. Палова — за непаспяховасць, палова — па ўласным жаданні. «Гэта сведчыць аб тым, што з прафарыентацыяй мы істотным чынам недапрацоўваем. І гэта нерэалізаваны патэнцыял для эканомікі краіны», — адзначыў Андрэй Іванец. Міністр расказаў, якія меры прымаюцца для ўдасканалення прафарыентацыйнай работы.

Па словах міністра адукацыі, сёння пры падрыхтоўцы студэнтаў трэба ісці ад жыцця, даваць ім тое, што спатрэбіцца непасрэдна падчас працы. «Для студэнтаў сёння ўжо з першага курса ўведзены практыкі. Наколькі яны якасна выконваюцца, пытанне пакуль што адкрытае. Мы ведаем, што ёсць і фармальны падыход, калі на прадпрыемствы прыходзяць студэнты, іх адпраўляюць дадому і пры гэтым адзначаюць, што практыка пройдзена. Тут яшчэ вялізнае поле для нашай працы», — сказаў Андрэй Іванец.

Важным элементам павышэння эфектыўнасці падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца мэтавы набор. Міністр адукацыі прызнаў, што тут ёсць шмат крытыкі. Разам з тым, дзякуючы мэтаваму прыёму выпускнік 11 класа ўжо ведае, дзе будзе працаваць і ўжо з першага курса прыцягваецца для праходжання практыкі на прадпрыемстве, дзе будзе працаваць.

# І ЯКАСЦЬ КЛАСІЧНАЙ АДУКАЦЫІ»

«Але не заўсёды на прадпрыемствах ствараюцца адпаведныя ўмовы, каб замацоўваўся малады спецыяліст. Трэба замацаваць настаўніка, трэба стварыць адпаведныя ўмовы працы, недзе з жыллём дапамагчы. Папросту кажучы — зацікавіць маладога чалавека», — звярнуў увагу міністр. Найбольшы мэтавы прыём — да 60 працэнтаў — ажыццяўляецца па педагагічных, медыцынскіх і аграрных спецыяльнасцях. Сёння дзейнічае каля 11,5 тысячы дагавораў мэтавай падрыхтоўкі, 3,6 тысячы чалавек набралі ў гэту прыёмную кампанію. «Галоўнае наша патрабаванне адно — якасць падрыхтоўкі. Для гэтага ўзмоцнены патрабаванні да набору і адпрацоўка — не менш за 5 гадоў», — сказаў Андрэй Іванец.

Яшчэ адзін важны аспект — размеркаванне маладых спецыялістаў. Толькі ў 2023 годзе падлягалі абавязковаму размеркаванню 17,3 тысячы выпускнікоў ВНУ. «Ці ўсе дайшлі да першага працоўнага месца? Толькі 16 тысяч, гэта значыць, каля 90 працэнтаў маладых спецыялістаў, прыйшлі на прадпрыемствы. Гэта амаль двухразовы рост за гэты год колькасці выпускнікоў, якія не пачалі адпрацоўку. Спаганяем сродкі — сёння каля 70 працэнтаў такіх маладых спецыялістаў ужо кампенсавалі, 5,7 мільёна беларускіх рублёў накіравана ў бюджэт. Гэта работа будзе прадоўжана, персанальная адказнасць ускладзена на рэктараў», — рэзюмаваў міністр адукацыі.

## ПАШЫРАНА ТРАЕКТОРЫЯ ДЛЯ ПАСТУПЛЕННЯ Ў ВНУ ТАЛЕНАВІТАЙ МОЛАДЗІ

Вялікае значэнне мае кадравы патэнцыял ВНУ. Па словах Андрэя Іванца, сёння ў многіх ВНУ не хапае выкладчыкаў. Але, па яго словах, справа не ў колькасці кандыдатаў ці дактароў навук, а ў іх якасці, наколькі якасна яны працуюць са студэнтамі. «Што для гэтага робіцца? Безумоўна, у ВНУ мы актыўна развіваем не толькі адукацыйнае асяроддзе, але і навуковую, інавацыйную сферу. Актыўна працуюць 34 галіновыя лабараторыі, якія створаны на базе буйных прамысловых прадпрыемстваў, функцыянуюць сем навукова-тэхналагічных паркаў. У даследчую дзейнасць уцягнуты каля 5 тысяч чалавек з прафесарска-выкладчыцкага складу. Пры гэтым асаблівую ўвагу ўдзяляем маладым вучоным, — прадоўжыў ён. Штогод прымаем у аспірантуру 500 чалавек, каля 80 — у дактарантуру, каля 150 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый у сістэме нашых ВНУ праходзяць штогод абарону, фактычна гэта кожная другая дысертацыя ў нашай краіне. Але патэнцыял тут яшчэ вялікі», — сказаў міністр адукацыі. Па яго словах, для ўкаранення навуковых распрацовак удасканальваецца інфраструктура ВНУ. З гэтага года адкрываюцца цэнтры кампетэнцый, якія будуць не толькі выконваць адукацыйную функцыю, але і прыцягваць маладых вучоных для ўкаранення вынікаў сваіх распрацовак у рэальны сектар эканомікі.

Сёння праводзіцца дыверсіфікацыя экспарта-адукацыйных паслуг. Па словах міністра адукацыі, актыўна развіваецца супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Створана 10 сумесных навукова-адукацыйных структур, рэалізоўваецца 40 сумесных адукацыйных праграм. Сёння больш чым 10 тысяч замежных студэнтаў — гэта студэнты з Кітая. Актыўна развіваецца супрацоўніцтва з краінамі СНД, пераважна гэта Узбекістан, Туркменістан, Таджыкістан. «Адкрываем Афрыканскі кантынент. Сёння гэта пакуль каля сямі працэнтаў нашага экспарту. Нараўне з традыцыйнымі афрыканскімі краінамі — Нігерыя, Марока, Камерун — развіваем супрацоўніцтва з Зімбабвэ і Экватарыяльнай Гвінеяй. Ужо сёння першыя студэнты з Зімбабвэ прыехалі вучыцца ў нашы ВНУ. Так, гэта яшчэ невялікая колькасць, але патэнцыял — вялікі», — падкрэсліў Андрэй Іванец. З гэтага года прадугледжаны прыём расійскіх абітурыентаў па выніках АДЭ за кошт бюджэту з наступным размеркаваннем на беларускія прадпрыемствы. У асноўным гэта запатрабаваныя спецыяльнасці — будучыя інжынеры, педагогі, работнікі сельскагаспадарчага профілю.

Сёлета менш выпускнікоў школ з'ехала за мяжу за вышэйшай адукацыяй, чым летась. Але тэндэнцыі застаюцца адмоўнымі. Андрэй Іванец расказаў, што зроблена для таго, каб іх выправіць. «Самае галоўнае — пашырана траекторыя для паступлення таленавітай матываванай моладзі ў ВНУ па льготах, без экзаменаў. Створаны асаблівыя ўмовы для медалістаў. Упэўнены, што і сёлета гэта дасць вельмі сур'ёзны вынік для таго, каб самыя лепшыя і самыя разумныя маладыя людзі засталіся ў нашай краіне», — падкрэсліў Андрэй Іванец.

Для замацавання кадраў на працоўных месцах пасля заканчэння ВНУ прапануецца кратна павысіць суму кампенсацыі маладымі спецыялістамі ў выпадку неадпрацоўкі па размеркаванні, а ў нейкіх выпадках, можа быць, поўнасцю адысці ад магчымасці кампенсацыі затрат за вучобу. «Таму што, скончыўшы ўніверсітэт, ты павінен стаць спецыялістам, а для гэтага мінімум два гады павінен адпрацаваць па сваёй прафесіі. Па асобных спецыяльнасцях, магчыма, мае сэнс разгледзець павелічэнне тэрмінаў адпрацоўкі маладымі спецыялістамі, у тым ліку і мэтавікамі», — растлумачыў міністр.

Міністр адукацыі ўказаў на важнасць удасканалення зместу падрыхтоўкі спецыялістаў. У 2022 годзе быў прыняты новы класіфікатар спецыяльнасцяў, згодна з якім была значна скарочана іх колькасць. За гэты год былі перапрацаваны адукацыйныя стандарты. «Але ці ўсё ў гэтыя кароткія тэрміны было зроблена на тым якасным узроўні, якога ад нас сёння патрабуе сітуацыя? Не. Мы правядзём поўную інвентарызацыю ўсіх адукацыйных стандартаў і вучэбных праграм, планаў з тым, каб сапраўды выйсці на якасную падрыхтоўку спецыялістаў, якія сёння ад нас чакаюць заказчыкі кадраў», — заявіў Андрэй Іванец.

Прэзідэнт звярнуў увагу на фінансава-эканамічны складнік дзейнасці ВНУ, кошт платнага навучання і рэнтабельнасці работы ўстаноў вышэйшай адукацыі. «Паглядзіце эканоміку дзейнасці ВНУ», — паставіў задачу ён. Аляксандр Лукашэнка жорстка запатрабаваў, у тым ліку ад урада і Міністэрства адукацыі вырашаць існуючыя праблемы дакладна, своечасова і з улікам сучасных патрабаванняў.

## ДАВАЦЬ ТЫЯ ВЕДЫ, ЯКІЯ САПРАЎДЫ ПАТРЭБНЫЯ

Сваімі поглядамі на праблемы і перспектывы сферы вышэйшай адукацыі падзяліліся і адказныя за гэта асобы.

Старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Аляксандр Гучок расказаў аб праблемах павышэння эфектыўнасці ўзнаўлення кадравага патэнцыялу навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі. Цэнтральная з трывожных тэндэнцый — павелічэнне сярэдняга ўзросту навуковых кадраў і зніжэнне колькасці прысуджаных вучоных ступеняў кандыдата навук.

Нягледзячы на ўсе складанасці, Прэзідэнт падкрэсліў, што зніжаць планку патрабаванняў да саіскальнікаў на атрыманне той ці іншай вучонай ступені недапушчальна. «Абы кандыдаты, абы дактары — яны нам не патрэбны, — сказаў ён. — Вы павінны жорстка стаяць на варце нарматыўна-прававой базы, якая фарміруе патрабаванні да гэтых саіскальнікаў. Ніякага тут паслаблення быць не павінна. Нам не патрэбны дысертацыі дзеля дысертацый. Жорсткі попыт тут павінен быць. «Ах, у нас менш кандыдатаў будзе!» Ну няхай менш, але гэта будуць сапраўдныя навукоўцы. Гэтаксама і дактары навук. Доктар навук — гэта свяціла».

Ірына Кітурка, рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, выступіла на тэму ролі вышэйшай школы ў выхаванні асобы і грамадзяніна. Па яе словах, сёння работу па ідэалагічным і патрыятычным выхаванні моладзі нельга ўспрымаць як нешта другараднае. Асабліва важную ролю ў гэтым адыгрывае выкладанне сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, але, акрамя гэтага, па словах рэктара, неабходна праводзіць дадатковыя мерапрыемствы. Напрыклад, дыялогавыя пляцоўкі, адкрытыя размовы, віктарыны і іншыя формы прамой работы з моладдзю.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу на ролю інтэрнэту ў жыцці людзей. Па яго словах, сёння трэба навучыцца супрацьстаяць уплыву штучнага інтэлекту. «Правільна вы сказалі — дыялогавыя пляцоўкі. Жывое слова. Да людзей трэба ісці. У нас кіруемая краіна, мы можам дастукацца да кожнага. Прыйсці і абвергнуць тое, што яны ўбачаць у сваіх смартфонах, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — У гэтае поле пераходзіць барацьба. Там і палітыка, і фінансы. Усё будзе там. І выбары, і нявыбары. Таму нам трэба рыхтавацца тут працаваць». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што моладзь трэба акунуць у жывую працу, даць маладым людзям жывое слова. Па яго словах, сёння ад інтэрнэту ўжо нікуды не падзецца. Але інтэрнэт можа быць і вялікай дапамогай. Трэба толькі правільна навучыцца працаваць, перш за ўсё з моладдзю.

Рэктар Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Віталь Веліканаў расказаў аб развіцці сістэмы падрыхтоўкі кадраў з улікам патрэбы рынкаў працы. Тут таксама на першым плане — практыка-арыентаваны падыход і стварэнне прывабных умоў для работы маладых спецыялістаў. Што датычыцца сельскагаспадарчай галіны, то, па словах рэктара, у школах створаны аграрныя класы. У мінулым годзе ў ВНУ на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці было залічана 343 выпускнікі такіх класаў. Але гэта толькі 20 працэнтаў вучняў тых класаў. Для павелічэння гэтай лічбы намаганні павінны прыкласці і самі ВНУ, і заказчыкі кадраў, трэба ўзмацніць работу з выпускнікамі і бацькамі. «Лепей да паступлення ў ВНУ зразумець, што гэта не тваё (калі яны ў аграрным класе ўбачылі, якая прафесія і спецыяльнасць іх чакае), чым адвучыцца чатыры гады і не прыйсці ў прафесію», — адзначыў Віталь Веліканаў.

Прэзідэнт пацікавіўся, ці не баяцца паступаць у Акадэмію людзі, якія ўжо працуюць у сельскай гаспадарцы. Віталь Веліканаў адказаў, што такія студэнты нават больш матываваныя і зацікаўленыя ў атрыманні ведаў і ўласным прафесійным развіцці, чым учарашнія выпускнікі школ. Кіраўнік дзяржавы таксама спытаў, як арганізавана вучоба такіх студэнтаў. Па яго словах, важна не напалохаць людзей завышанымі патрабаваннямі або перагружанай адукацыйнай праграмай, а мэтанакіравана даваць студэнтам менавіта тыя веды, якія ім неабходны. Кіраўнік дзяржавы абазначыў гэта пытанне ў тым ліку на ўласным вопыце, таму што ў свой час скончыў сельскагаспадарчую акадэмію па эканамічным профілі. «Гэта трэцяя ўжо была адукацыя пасля палітычнай (першая — гістарычная). Я свядома прыйшоў на эканамічны факультэт, таму я ведаў, што ў сельскай гаспадарцы мне і патрэбна будзе эканомка. Усё астатняе — раслінаводства, жывёлагадоўля і іншае, — я там асвою на практыцы. Я — вясковы», — сказаў ён. Аднак, як успомніў Аляксандр Лукашэнка, падчас вучобы прыйшлося сутыкнуцца з прадметамі, якія зусім няпрофільныя для сельскай гаспадаркі. «Статыстыка на такім узроўні! Я, Прэзідэнт сёння, успамінаю — і думаю: навошта гэта мне было? Таму задаю пытанне, і прад'яўляю патрабаванні да вашых праграм, і ўяўляю загадчыцу фермы, якая папрацавала крыху пасля каледжа. Выдатны спецыяліст, але да вас яна не пойдзе — яна баіцца вашай праграмы, яна баіцца вучыцца ў гэтай акадэміі, — прывёў прыклад кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, важна не спрашчаць праграму, а даваць студэнтам тыя веды, якія ім сапраўды патрэбныя.

## НІЯКАЙ НЕ МОЖА БЫЦЬ ЯКАСЦІ БЕЗ НАВУКІ І АДУКАЦЫІ

Падводзячы вынікі нарады, Прэзідэнт растлумачыў, чаму ён так жорстка ставіць гэта і іншыя пытанні: «У нас ідзе змена пакаленняў. Усе, якія сядзяць тут, рана ці позна сыдуць. А хто прыйдзе за намі? Зможам мы спакойна жыць на пенсіі? Ці не будзем мы сябе дакараць, што нешта не зрабілі? Трэба ўсім заварушыцца, ускалыхнуцца! Ад нас жа з вамі залежыць, што будзе заўтра ў Беларусі». Па словах кіраўніка дзяржавы, сёння трэба выбудаваць нармальную сістэму і пакінуць яе наступным пакаленням. «І мы ж не паміраем. Мы будзем глядзець збоку, будзем локці кусаць: чаму мы гэтага не зрабілі, чаму не вырашылі. Трэба прывесці ў прытомнасць вышэйшую школу. Без гэтага мы нікуды не рушым», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што ў наступным годзе з усіх сур'ёзна спытаюць за прыём абітурыентаў і камплектаванне ВНУ. «У адваротным выпадку навошта рэктар патрэбны? А ўжо рэктар павінен закруціць усіх. Гэта ж не справа: збіраемся і тут адзін аднаму расказваем, якія ў вас праблемы і складанасці. Ну, вы іх вырашайце на сваім узроўні. І трэба спыніць гэту балбатню і ўсякія размовы».

Адносна практыка-арыентаванага падыходу ў падрыхтоўцы спецыялістаў беларускі лідар адзначыў, што ўжо падчас навучання ва ўніверсітэце малады чалавек павінен убачыць сваю спецыяльнасць на практыцы, пабыць на прадпрыемстве ці ў полі. Ён павінен паглядзець на сваю будучыню. Але часта перашкодай для рэалізацыіі такога падыходу, ды і іншых становіцца фармалізм. Кіраўнік дзяржавы настойвае на тым, што ніякага фармалізму быць не павінна, ва ўсіх аспектах.

Асобную ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на дзейнасць студэнцкіх аб'яднанняў. «Як кажуць: «Ну, не кожны павінен быць у БРСМ». Не кожны там будзе, натуральна. Не хоча і іншае. Але змагацца БРСМ павінен за кожнага. Але не проста прыйсці там, казку нейкую расказаць ці зацягнуць сілай, а сваімі мерапрыемствамі. Нармальнымі, нефармальнымі. Не толькі для таго, каб у тэлевізары паглядзеў Прэзідэнт ці яшчэ хтосьці. Трэба нефармальна», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён выказаўся і наконт іншых маладзёжных аб'яднанняў, якія дзейнічаюць у ВНУ. «Няхай гэта будзе на базе БРСМ, прафсаюзаў, студэнцкіх саветаў пры ВНУ і гэтак далей. Трэба, каб кожны займаўся сваёй справай. Каб дубляжу не было. Вызначыцеся. Вось аб'ём работы са студэнтамі: гэты кавалак — БРСМ, гэты — прафсаюз, гэты — студэнцкі савет. Кожнаму — сваё. Тады не будзе дубляжу. І разам яны павінны працаваць. Усё гэта накіроўвае рэктар», — расклаў беларускі лідар.

Прэзідэнт заўважыў, што вучоба ў ВНУ — няпросты перыяд у жыцці маладога чалавека. Але гэтым перыядам нельга палохаць людзей. Па яго словах, рэктары павінны ствараць такія ўмовы ў сваіх ВНУ, каб людзі хацелі да іх паступаць, распрацаваць цікавыя вучэбныя праграмы.

«Для мяне важна, каб мы не страцілі яшчэ і прывабнасць беларускай адукацыі. Я жорстка стаўлю гэтае пытанне не таму, што ў нас зусім дрэнна. Не. 30 тысяч навучаюцца з-за мяжы і плацяць добрыя грошы. Значыць, не ўсё дрэнна. Але трэба ўзварухнуцца, каб было лепш. Таму што заўтра страцім той узровень, які ёсць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Вярнуўся беларускі лідар і да пытання падручнікаў. Дысцыплін, у якіх гэта пытанне патрабуе перагляду, не так шмат. Напрыклад, у дакладных навуках такой неабходнасці няма, гэта больш датычыцца гуманітарных дысцыплін. Падрыхтоўку абноўленых падручнікаў Прэзідэнт прапанаваў даручыць рэктарам. Па яго словах, матэрыял павінен выкладацца зразумелай мовай. Калі трэба, нешта варта ўзяць з савецкіх падручнікаў.

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз канстатаваў, што ўсе праблемы, агучаныя на нарадзе, рэктары, вышэйшыя службовыя асобы павінны перагледзець і да 1 верасня вырашыць. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што навуцы належыць удзяліць першачарговую ўвагу. «Трэба спланаваць маю работу ў ВНУ, Акадэміі навук, навуковых установах», — сказаў ён. Прэзідэнт падкрэсліў, што, калі на парадку дня стаяла вырашэнне практычных пытанняў, яму больш важна было працаваць на палях і на прадпрыемствах. Але сёння, калі многія з гэтых пытанняў вырашаны, трэба працаваць на больш высокім узроўні. «Навука — вось што нам трэба. Гэта асноўнае звяно, за якое, ухапіўшыся, мы можам выцягнуць увесь ланцуг. І адукацыя. Ніякай не можа быць якасці без навукі і адукацыі», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Для гэтага, па яго словах, неабходна пераарыентаваць фінансаванне і грашовыя патокі, дзе неабходна. «Але толькі пад канкрэтны вынік. І вельмі жорстка пытаць за выкананне», — папярэдзіў Прэзідэнт. Па яго словах, неабходна прывесці ў прытомнасць вышэйшую школу, адладзіць работу з моладдзю. І гэта работа, як арыентуе беларускі лідар, павінна праводзіцца пастаянна, бо без руху не будзе развіцця.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# БЫЦЬ ПІЛЬНЫМІ ЗАЎСЁДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Асноўным застаецца вішынг — званкі патэнцыяльным пацярпелым ад прадстаўнікоў альбо банкаўскіх устаноў, альбо ад імя супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Што характэрна гэтаму віду злачынстваў? У ходзе размовы на патэнцыяльнага пацярпелага ўздзейнічаюць, каб ён у самы кароткі час здзейсніў нейкае няправільнае дзеянне, прыняў няправільнае рашэнне: перадаў трэцяй асобе рэквізіт доступу ад свайго мабільнага банкінгу, усталяваў дадатак аддаленага доступу на мабільную прыладу і гэтак далей.

**«Вопыт процідзеяння фроду паказвае, што ашуканцы пастаянна адсочваюць меры, якія прымаюцца ў дачыненні да іх, і вынаходзяць новыя спосабы супрацьпраўных дзеянняў. Таму кожны з карыстальнікаў паслуг электрасувязі павінен клапаціцца пра сваю бяспеку і праяўляць пільнасць».**

Падстаў для такіх дзеянняў таксама можа быць шмат: гэта і падазроная актыўнасць на банкаўскім рахунку, здзяйсненне пераводу грошай у адрас невядомай асобы і нібыта афармленне крэдыту з выкарыстаннем пашпартных даных патэнцыяльнага пацярпелага. «Даходзіць да таго, што пад такім эмацыянальным уздзеяннем некаторыя пацярпелыя нават прадаюць маёмасць, якая ёсць у іх дома, і нават нерухомасць. У гэтым выпадку неабходна памятаць, што ніколі супрацоўнікі міліцыі, іншых праваахоўных органаў, банкаўскіх устаноў не будуць тэлефанаваць на мабільныя тэлефоны, тым больш на месенджары, і ўдакладняць нейкую інфармацыю, звязаную з грашыма і банкаўскімі рахункамі», — распавёў Дзмітрый Стасюлевіч.

Ён адзначыў, што вяртаецца такі спосаб здзяйснення злачынстваў, як «Алё, мама!». Рэгіструюцца нячаста, але ўсё ж такі такія злачынствы ёсць. Гэта званкі патэнцыяльным пацярпелым ад сваякоў, якія нібыта трапілі ў дарожна-транспартнае здарэнне. Пры гэтым неабходна перадаць грошы менавіта кур'еру для вырашэння таго ці іншага пытання.

## Дэклараванне праз... кур'ера

Таксама ў канцы мінулага года пачалі рэгістравацца злачынствы, падставай у якіх гучыць неабходнасць задэклараваць усе грашовыя сродкі, якія маюцца дома. Потым прапануецца перадаць іх так званаму кур'еру, супрацоўніку праваахоўных органаў або прыйсці ў банкаўскую ўстанову і пакласці іх на рахунак для таго, каб было відаць, якая колькасць грашовых сродкаў ёсць, нібыта каб іх не выкралі. Аднак трэба разумець, што самамэта ў зламыснікаў заўсёды адна — гэта выкраданне грошай. У ведамстве нагадалі, што супрацоўнікі міліцыі не маюць зносіны з людзьмі ў месенджарах, а таксама не дасылаюць туды фота сваіх пасведчанняў.

«Актуальнай праблемай застаюцца і фішынгавыя спасылкі. Гэта спасылкі на падробленыя сайты, якія па сваім знешнім інтэрфейсе нагадваюць легітымны сайт,



як правіла, банкаўскай установы, Белпошты, службы дастаўкі і гэтак далей», — праінфармаваў начальнік упраўлення.

Фішынгавая спасылка можа з'явіцца ў якасці рэкламнай пры выкарыстанні аднаго з інтэрнэт-пошукавікаў. Яе можна атрымаць і ў асабістай перапісцы са зламыснікам, напрыклад, пры продажы якога-небудзь тавару, дапусцім, у сацыяльных сетках. У гэтых выпадках праваахоўнікі рэкамендуюць звяртаць увагу на даменнае імя наведвальнага сайта.

## Пакупнікі таннай «халявы»

Начальнік упраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці адзначыў, што застаюцца праблемай у нас гандлёвыя пляцоўкі, на якіх купляюць і прадаюць тавары. Некаторыя людзі, зацікаўшыся нізкай цаной тавараў, даюць невядомым перадаплату, чакаючы, што праз 2—3 тыдні гэты тавар усё ж такі прыйдзе, але ён не прыходзіць. «Рэкамендацыя: не набываць тавары з якой-небудзь перадаплатай і дастаўкай. Можна купіць тавар, аплаціўшы яго пры атрыманні, гэта засцеражэ вас і вашы грошы», — раіць Дзмітрый Стасюлевіч.

**«Белтэлекам» працуе толькі з сігнальным трафікам, змест размоў спецыялістам недаступны, таму дакладна ўстанавіць, ці здзяйсняецца выклік ашуканцамі, мы не можам».**

На яшчэ адзін від махлярства трапляюцца ахвотныя хутка разбагацець. «Часта ў апошні час выкарыстоўваюцца сайты, якія ўяўляюць сабой нібыта крыптабіржы і біржы ў цэлым. Звязваючыся з пацярпелымі, ашуканцы абяцаюць вельмі вялікі прыбытак. Для гэтага неабходна толькі пераводзіць грошы і папаўняць рахунак. Пры гэтым за кожным пацярпелым замацоўваецца так званы менеджар, які будзе падказваць, як гандляваць і што рабіць. Аднак усё гэта, зразумелая справа, у выніку аказваецца выкрутам махляроў.

Людзі губляюць усе грошы, бо пераводзяць іх не ў нейкі асабісты кабінет на рахунак біржы. Часам зламыснікі пераконваюць пацярпелых ва ўзнікненні цяжкасцяў з пералічэннем грошай, вырашыць якія можна, яшчэ раз папоўніўшы рахунак. Для гэтага некаторыя пацярпелыя нават бралі крэдыты», — праінфармаваў начальнік упраўлення.

Яшчэ адзін распаўсюджаны від махлярства — званкі ад нібыта супрацоўнікаў праваахоўных органаў і просьбы ад іх прыняць удзел у спецаперацыі па выяўленні зламыснікаў у банкаўскай сферы. «У гэтых выпадках людзей вымушаюць у тым ліку браць крэдыты. Гэта адзін з прыкладаў. На самай справе спосабы мяняюцца пастаянна.

## Чаму не заўсёды можна вылічыць махляроў?

Як паведаміў **начальнік сектара аналізу і кантролю трафіку службы бяспекі «Белтэлекама» Павел ДАВІДОВІЧ,** іх спецыялісты штодня сутыкаюцца з рознымі відамі супрацьпраўнай дзейнасці і актыўна змагаюцца з махлярствам. Супрацьзаконныя дзеянні ў сетках электрасувязі з мэтай атрымання нелегальнага даходу можна падзяліць на два віды. Гэта здзяйсненне аперацый, якія парушаюць устаноўлены парадак пропуску трафіку, і выкарыстанне паслуг «Белтэлекама» для атрымання асабістай інфармацыі карыстальнікаў, напрыклад лагінаў, пароляў, рэквізітаў банкаўскіх картак або матэрыяльных сродкаў, зразумела, падманным шляхам.

З першым выглядам махлярства людзі сутыкаюцца, калі міжнародны выклік паступае ад нібыта знаёмага чалавека, але з невядомага або замежнага нумара альбо калі ў непрацоўны час абанент атрымлівае вялікую колькасць званкоў ад якой-небудзь дзяржаўнай арганізацыі. Другі від махлярства на дадзены момант уяўляе найбольшую пагрозу. Грамадзян падманваюць з дапамогай SMS або электронных паштовых паведамленняў са спасылкамі на шкодносныя (фэйкавыя) інтэрнэт-рэсурсы або званкоў, як тэлефонных, так і ў месенджарах Viber, WhatsApp і іншых.

Сапраўдныя крыніцы свайго падключэння да сеткі агульнага карыстання аферысты хаваюць. Гэта значыць, IP-адрасы, акаўнты, нумары тэлефонаў, якія бачыць чалавек на прыладзе, рознымі спосабамі падмяняюцца на іншыя, якія не належаць злачынцам.

— Для процідзеяння гэтаму віду махлярства спецыялісты «Белтэлекама» ў рамках дадзеных ім правоў праводзяць аналіз сігнальнага тэлефоннага трафіку і выяўляюць тэлефонныя выклікі, якія могуць з'яўляцца ашуканскімі. Падкрэслю, што «Белтэлекам» працуе толькі з сігнальным трафікам, змест размоў спецыялістам недаступны, таму дакладна ўстанавіць, ці здзяйсняецца выклік ашуканцамі, мы не можам, — паведаміў Павел Давідовіч.

Аналіз статыстыкі парадку праходжання ашуканскіх тэлефонных выклікаў паказвае, што ўсе яны паступаюць з-за мяжы, з нумароў, якія належаць замежным аператарам сувязі, устанавіць якія па наяўнай у сетцы «Белтэлекама» інфармацыі тэхнічна немагчыма. На падставе атрыманых звестак работнікі кампаніі прыходзяць да наступнай высновы: першапачаткова ашуканцы не валодаюць поўнай інфармацыяй аб абаненце, якому яны тэлефануюць. Злачынцы ажыццяўляюць веерны абзвон тэлефонных нумароў пэўнага рэгіёна краіны ў аўтаматычным рэжыме (напрыклад з дапамогай ботаў), затым — адрасны, гэта значыць, звязваюцца з тымі людзьмі, якія ў гэты час, цалкам магчыма, знаходзяцца дома і здымуць трубку.

Многія абаненты самі перарываюць тэлефонную размову, паколькі вылічаюць махляра, частка з іх паведамляе аб выкліку ў праваахоўныя органы або ў службу тэхнічнай падтрымкі. Астатніх карыстальнікаў аферыстам атрымліваецца падмануць.

— Наш вопыт процідзеяння фроду паказвае, што ашуканцы пастаянна адсочваюць меры, якія прымаюцца ў дачыненні да іх, і вынаходзяць новыя спосабы супрацьпраўных дзеянняў. Таму кожны з карыстальнікаў паслуг электрасувязі павінен клапаціцца пра сваю бяспеку і праяўляць пільнасць, — адзначыў спецыяліст. Улічваючы маштабы праблемы, работнікі «Белтэлекама» працуюць над яе ліквідацыяй ва ўзаемадзеянні з іншымі беларускімі і замежнымі аператарамі сувязі, праваахоўнымі органамі і міжнароднымі арганізацыямі.

**На яшчэ адзін від махлярства трапляюцца ахвотныя хутка разбагацець. «Часта ў апошні час выкарыстоўваюцца сайты, якія ўяўляюць сабой нібыта крыптабіржы і біржы ў цэлым. Звязваючыся з пацярпелымі, ашуканцы абяцаюць вельмі вялікі прыбытак. Для гэтага неабходна толькі пераводзіць грошы і папаўняць рахунак. Пры гэтым за кожным пацярпелым замацоўваецца так званы менеджар, які будзе падказваць, як гандляваць і што рабіць».**

РУП «Белпошта» яшчэ раз нагадвае, што азнаёміцца з інфармацыяй аб аказанні паслуг паштовай сувязі можна на афіцыяльным сайце belpost.by. У выпадку ўзнікнення праблемных пытанняў звяртайцеся ў кантакт-цэнтр прадпрыемства па нумары 154.

## Рэкамендацыі для абанентаў:

— Сачыце за станам інфармацыйнай бяспекі гаджэтаў, сродкаў вылічальнай тэхнікі і іншага праграмна-тэхнічнага забеспячэння, у тым ліку офісных аўтаматычных тэлефонных станцый.

— Не пераходзьце па спасылках з SMS або электронных лістоў, паведамленняў месенджараў, калі вы іх не запытвалі.

— Не спампоўвайце праграмныя дадаткі з неправераных крыніц, нават калі ў якасці адпраўніка паказаны вядомы вам кантакт (яго маглі ўзламаць).

— Не паведамляйце нікому па тэлефоне персанальныя даныя, уключаючы рэквізіты банкаўскіх картак, коды аўтарызацыі і гэтак далей.

— Не ператэлефаноўвайце, калі высвечваецца неадказны выклік. Вас могуць перанакіраваць на іншы нумар прэміум-класа, і чым даўжэй вы застаняцеся на лініі, тым больш адчувальным апынецца ўдар па кашальку.

— Калі вам паступае тэлефонны выклік з-за мяжы ад знаёмага абанента, але з нумара, які яму не належыць, то неабходна паведаміць пра гэта чалавеку і парэкамендаваць яму звярнуцца да аператара сувязі з прычыны неналежнага аказання паслугі.

## Крыптавалюта — гэта рызыка, без неабходных ведаў — двайная

**Начальнік аддзела па аналізе практыкі і метадычнага забеспячэння папярэдняга расследавання УСК па горадзе Мінску Пётр МІКУЛА** адзначыў, што крыптавалюта як спосаб заробку — рызыка. Гэта, па сутнасці, прадпрымальніцкая дзейнасць. Няхай яна такой не прызнаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам, але па сваёй сутнасці гэта дзейнасць, накіраваная, як у нас напісана ў Грамадзянскім кодэксе, на атрыманне прыбытку на свой страх і рызыку. А што датычыцца захоўвання, то, зноў жа, памятаем пра тое, што ў любы момант такая лічбавая валюта можа перастаць каштаваць наогул, упэўнены спецыяліст.

Калі мы гаворым пра самыя вядомыя і самыя дарагія крыптавалюты, такія коіны, як біткоін, этэрыум, доджкоін, гэта ўсё ж такі свайго роду прадпрымальніцкая рызыка, прычым значная. І гэта свайго роду фінансавыя піраміды, бо ўсім нам вядома, што яны валодаюць вельмі высокай ступенню валацільнасці. І зарабіць у дадзеным выпадку можна толькі на скачках курса. Але іх немагчыма спрагназаваць, імі немагчыма кіраваць, лічыць наш эксперт.

Так, ёсць пэўныя маркеры, якія сведчаць аб тым, што ў хуткім часе гэты курс можа значна павялічыцца або значна ўпасці. Але ніхто гэтым не кіруе. Таму казаць пра тое, што гэта добры спосаб зберажэння, не даводзіцца, бо, набыўшы сёння некалькі біткоінаў за тысячы долараў, заўтра яны могуць не каштаваць ужо нічога або каштаваць некалькі долараў.

Акрамя таго, існуюць незаконныя крыптаабменнікі. Яны паступаюць наступным чынам: прадаюць «крыпту» за наяўныя грошы. Гэта значыць, яны дазваляюць ашуканцам, рознага роду зламыснікам свой злачынны даход канвертаваць у крыптавалюту. А ўжо якім чынам яны далей будуць распараджацца, ніхто гэтага ніколі не даведаецца. Таму трэба разумець, што празрыстай, законнай можа быць дзейнасць толькі з легальнымі, афіцыяльнымі крыптабіржамі. Але трэба памятаць пра фішынгавыя спасылкі і старанна, уважліва правяраць тыя сайты, дзе мы ўводзім якую-небудзь плацежную інфармацыю.

І абавязкова, што датычыцца крыптабіржаў і крыптаабменнікаў, у кожнага з іх ёсць тысячы, дзясяткі тысяч водгукаў. Гэта абавязкова трэба правяраць, бо інакш мы можам страціць усе свае плацежныя даныя. А следам — і грошы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Працяг тэмы

# УЖО З ЛЕСВІЦАЙ

## Кароткая дарога дадому стала бяспечнай

**Пра мікразону Падгорная — Падміколле «Звязда» пісала неаднойчы. Асаблівасць гэтай часткі горада ў тым, што яна знаходзіцца ў нізіне і сувязь з горадам падтрымліваецца, у тым ліку, з дапамогай шматлікіх лесвіц. Адна з іх якраз у раёне гарадской радзільні па вуліцы імя Тані Карпінскай. Некалькі гадоў таму газета пісала пра аварыйны стан лесвіцы. Яна была драўляная, месцамі паламаная, на некаторых пралётах адсутнічалі прыступкі. Ініцыятарам рэпартажу выступіў староста мікразоны Аляксандр ПІКУЛЯ. Гэтым разам ён запрасіў нас, каб парадавацца вынікам якасна зробленай работы.**



### Гаспадар мікразоны

Лесвіца дапамагае жыхарам Падміколля значна скараціць свой шлях дамоў. А яшчэ для ўсіх пешшу прайсціся да жамчужыны беларускага дойлідства — помніка XVIII стагоддзя Свята-Мікольскага жаночага манастыра і здзейсніць цікавую прагулку па гістарычным месцы. Тут праходзіць знакаміты шлях, па якім праязджалі карэты расійскай імператрыцы Кацярыны II і аўстрыйскага імператара Іосіфа II для сустрэчы манаршых асоб у Магілёве ў 1780 годзе. На жаль, бруккаванка, па якой яны ехалі, сёння знаходзіцца пад асфальтам. Але пры добрай фантазіі гэта ўсё можна ўявіць. А нагода прайсціся — адноўленая, металічная лесвіца. Кажуць, што яна не абледзянее. Дарэчы, была магчымасць праверыць на месцы. Прыём аб'екта карэспандэнт «Звязды» здзейсніла якраз у панядзелак, калі пешаходныя дарожкі нагадвалі каток. Затое па лесвіцы можна было крочыць смела. Нават не трымаючыся за парэнчы.

На сустрэчу старасты прыйшоў з групай падтрымкі. З Аляксандрам Цемруком яны працуюць разам у вулічным камітэце. А Ірына Бондарава вельмі добра ведае актыўнага старасту. Яна жыве на ўзвышшы, якраз насупраць радзільні, на вуліцы імя Тані Карпінскай. Лесвіцай жыхарка карыстаецца пастаянна, ходзіць у краму, царкву, проста прагульваецца. Успамінае, што гэтым шляхам у дзяцінстве разам з сябрамі бегала на Днепр купацца. А сёння яшчэ перыядычна наведваецца на могілкі, якія знаходзяцца ў нізіне.

— Лесвіца раней была драўляная, у вельмі дрэнным стане, — кажа яна. — Перыядычна прападала то адна-дзве прыступкі, а бывала і тры. І даводзілася караскацца з рызыкай для жыцця. А ўяўляеце, як складана ісці з цэнтра горада, напрыклад, жанчыне з сумкамі ў руках? Людзі падалі, атрымлівалі траўмы, нават я аднойчы ледзь не пакалечылася. Дзякуючы нашаму Аляксандру Васільевічу Пікулю парадак тут заўсёды падтрымліваўся, лесвіцу чысцілі пастаянна.

Аляксандр Пікуля — народны герой у сваёй мікразоне. Больш актыўнага і прынцыповага старасту не знайсці ва ўсім Магілёве. Яго прозвішча добра ведаюць камунальныя службы горада і супрацоўнікі выканкамаў, чыя дзейнасць звязаная з навядзеннем парадку і стварэннем камфортных умоў пражывання для магіляўчан. Ён ужо на пенсіі і сваёй галоўнай задачай лічыць клопат аб тым, каб сувязь паміж яго мікразонай і горадам не перарывалася. У той дзень, калі я, балансуючы на слізкай дарозе, ішла на сустрэчу, ён ужо ў пяць раніцы вёў перагаворы з дарожна-маставым прадпрыемствам, каб там не забыліся зрабіць падсыпку дарогі крутога дзябранскага спуску. Па гэтым небяспечным маршруце курсіруе гарадскі аўтобус. Дарогу падсыпалі, але староста даведаўся, што першы рэйс усё ж такі не адбыўся. Аўтапарк не стаў рызыкаваць. Зразумець адказных асоб можна. Дарога вузкая, крутая. Тады Пікуля зноў сеў за тэлефон і пачаў дагаворвацца, каб яшчэ раз зрабілі падсыпку. Дзякуючы настойлівасці пенсіянера, другі ранішні рэйс на 7 гадзін ужо адбыўся.

### Каманда аднадумцаў

Месцічы на нарадуюцца на новую лесвіцу. Дарэчы, металаканструкцыі рабіла для яе вядомае магілёўскае прыватнае прадпрыемства «Протас». Непасрэдна ўстаноўкай займаліся работнікі ДМП, працэс кантралявалі работнікі Упраўлення камунальных прадпрыемстваў. Гэтыя падзеі падрабязна каментаваліся ў мясцовых СМІ. І сам аб'ект сёння ўспрымаецца як свята. Прыемна глядзець на яго, не кажучы ўжо пра тое, як зручна хадзіць.

— Гэтай лесвіцай карыстаюцца дзеці, якія вучацца ва ўстановах адукацыі, што ў цэнтры, а жывуць у мікразоне, мае знаёмыя, якія ходзяць у мікрараён Юбілейны, гэта самы кароткі шлях, — аргументуе Ірына Бондарава. — Прайшоў па мастку праз Дзебру, падняўся ўгару, і ты на месцы.

Колькі гадоў у гэтым месцы існавала лесвіца, ніхто не ведае. Яна была заўсёды. Летась вясной тут пацярпела жанчына. Пад ёй праваліліся прыступка, і яна разам з сумкамі паляцела ўніз. Абышлося без пераломаў, але сінякоў і удараў было шмат. Да таго ж частка прадуктаў так і засталася пад лесвіцай.

— А яшчэ тут праходзіць шмат жыхароў з вуліцы Катоўскага, іншых вуліц, — удакладняе Аляксандр Пікуля. — Аўтобус у нас адзін, і не ўсе паспяваюць трапіць на канкрэтны рэйс. Трэба тады ісці пешшу.

Галоўным аргументам для ўладкавання новай лесвіцы стаў калектыўны зварот, пад якім подпісы паставілі 114 жыхароў мікразоны. Аляксандр Пікуля асабіста паклапаціўся скласці такую паперу. Ведаў, што для новага мэра горада Аляксандра Студнева справа гонару — навесці парадак у родным Магілёве. І адказ не прымусіў сябе доўга чакаць.

— Нам бы яшчэ адну лесвіцу ўдасканаліць, якая выходзіць на прыпынак 12-га аўтобуснага маршруту, — марацьь актывісты. — Там пакуль яшчэ драўляная. На сёння з усіх нашых лесвіц засталіся дзве драўляныя — у завулках Бетховена і Рачным. Астатнія шэсць — металічныя і жалезабетонныя. Спадзяёмся, што з драўлянай лесвіцай па завулку Рачны мы на наступны год развітаемся, замест яе таксама з'явіцца нешта больш грунтоўнае. Галоўнае, што самая праблемная лесвіца ўжо заменена. Тут людзі больш чым дзе траўмаваліся.

Аляксандр Пікуля дэманструе фота, як выглядаў гэты стратэгічны аб'ект раней. Відаць, што драўляныя дэталі збіраліся як папала. Нават парэнчы розныя.

### Дзябранскі спуск

У калектыўным звароце да мэра горада ўзнімалася пытанне зрабіць не толькі лесвіцу, але і больш камфортным увесь дзябранскі спуск. Тут знаходзіцца адна з найбольш небяспечных для Магілёва дарог. Да таго ж яна адзіная, па якой можна трапіць у мікразону. З лесвіцай разабраліся, але планы па ўдасканальванні гэтага ўчастка ў вулічнага камітэта вялікія. Падчас нашай размовы далучыўся прадстаўнік «Зеляньбуда», які кантралюе зялёнае будаўніцтва ў мікразоне. Арганізацыя працуе з улікам заўваг няўрымслівага старасты.

У развіцці тутэйшай мясцовасці і навядзенні прыгажосці зацікаўлены і Аляксандр Цямрук.

— Мы вельмі рады, што гэта лесвіца нарэшце атрымала годны выгляд, — кажа ён. — Яшчэ б хацелася, каб тут зрабілі больш грунтоўнае добраўпарадкаванне. Тэрыторыя зарастае амерыканскім клёнам, а гэта дрэва на другім месцы па шкоднасці пасля баршчэўніку. Ад яго вельмі цяжка пазбавіцца. У нашым выпадку гэта яшчэ і небяспечна, бо летам галіны дрэў навісаюць наўпрост над дарогай і памяншаюць яе агляднасць. А восенню ўся лістота падае на дарогу і робіць яе яшчэ больш небяспечнай. Да таго ж амерыканскі клён закрывае прыгожую панараму ад вачэй турыстаў. Сюды звычайна пад'язджае экскурсійны аўтобус, які працуе на рэспубліканскім турыстычным маршруце. І што людзі могуць убачыць? Лепш пасадзіць туі — і прыгожа, і паветра ачышчаюць.

Аляксандр прызнаецца, што яму падабаецца, калі вакол парадак. І лічыць, што шмат залежыць не толькі ад дзяржавы, але і ад саміх людзей. Кажа, што трэба самім дзейнічаць, а не чакаць, калі нехта прыйдзе і зробіць. Суботнікі таксама можна самім арганізоўваць, важна праявіць грамадзянскую пазіцыю.

Другая прыемная навіна ад жыхароў нізіны — сёлета будзе зроблены пандус да яшчэ адной лесвіцы, пра якую «Звязда» таксама пісала. Гэта ў супрацьлеглым баку, у раёне моста па вуліцы Каралёва. Аляксандр Пікуля з гэтым пытаннем пабываў у тым ліку і на прыёме ў памочніка Прэзідэнта — інспектара па Магілёўскай вобласці Леаніда Мартынюка. Становучае рашэнне прынята, тэрмін акрэслены — да 1 верасня.

— 20 гадоў таму быў створаны самы моцны ў горадзе вулічны камітэт, у які ўвайшлі 10 чалавек, — кажа пра сваю каманду Аляксандр Пікуля. — Праз паўгода мы ўжо шмат чаго зрабілі. Нам паклалі асфальт, адрэгулявалі ліўневы калектар, пачалася рэканструкцыя дзябранскага спуску. Цяпер у нашым камітэце тры чалавекі. Але мы працуем у ранейшым рытме і робім больш зручным і прыгожым наш горад.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Politico: «Распад НАТА з'яўляецца ўсяго толькі пытаннем часу»



Зыход прэзідэнцкіх выбараў у ЗША вызначыць для Еўропы тое, наколькі хутка распадзецца НАТА. Такім меркаваннем падзяліўся аглядальнік Politico Мэцью Карнічніг у сваім матэрыяле, апублікаваным на сайце выдання. На яго думку, Еўрапейскаму саюзу стала рызыкоўна разлічваць на ЗША ў пытаннях гарантавання ўласнай бяспекі: «Рэальнасць такая, што, хто б ні перамог у лістападзе, прынцып MAGA (Make America Great Again («Зробім Амерыку зноў вялікай») — галоўны палітычны лозунг Трампа ў яго выбарчай кампаніі 2016 года. — **Рэд.**) застанецца фактарам амерыканскай палітыкі яшчэ нейкі час. Хто скажаў, што рэспубліканскі спадчыннік Трампа не адновіць сваю антынатаўскую накіраванасць? Гэта рызыка, якую Еўропа не можа дазволіць сабе ігнараваць. Па меркаванні Карнічніга, нягледзячы на тое, што агульныя выдаткі на абарону ў Еўропе за апошнія гады ўзраслі, іх усё роўна недастаткова: «Каб замяніць амерыканскі патэнцыял, які НАТА страціў бы без ЗША, спатрэбіцца дзесяцігоддзі і незлічоныя мільярды. І большасць еўрапейскіх лідараў нават не прынялі халодную рэальнасць таго, што амерыканская абарона ўжо фактычна знікла. Нават калі Еўропа ўсведамляе рэаліі, з якімі яна сутыкаецца, цалкам можа быць занадта позна».

### У Нігерыі больш за 300 чалавек затрымалі па падазрэнні ў захопе заложнікаў



Паліцыя Нігерыі затрымала ў сталіцы краіны Абуджы 307 чалавек, якія падазраюцца ў захопе заложнікаў, заявіў начальнік сталічнай паліцыі Бенет Ігвэ. Пра гэта паведаміла ТАСС. Па словах Ігвэ, у падазраваных канфіскавалі агнястрэльную зброю. Начальнік сталічнай паліцыі адзначыў, што затрыманыя, у дачыненні да якіх узбуджаны крымінальныя справы, паўстануць перад судом. Паведамляецца, што захоп заложнікаў стаў у апошнія гады ў Нігерыі прыбытковым падпольным бізнесам. Ён прыносіць вялікі даход за кошт выкупу за вызваленне выкрадзеных людзей.

### Школы і дзіцячыя садкі на паўднёвым усходзе Аўстраліі закрылі з-за рызыкі лясных пажараў



На паўднёвым усходзе Аўстраліі з-за пагрозы лясных пажараў закрылі каля 40 агульнаадукацыйных школ і 20 дзіцячых садкоў. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на заяву ўрада штата Вікторыя. Экстрэмальная спякота ў гэтым рэгіёне можа захавацца да канца тыдня. Дзяржаўнае метэаралагічнае бюро паведаміла, што тэмпература паветра будзе дасягаць 30 градусаў вышэй за нуль, а ў асобных раёнах прагрэецца да 40 градусаў. Акрамя таго, прагназуюцца навальніцы з маланкамі і моцным ветрам. Такія фактары з'яўляюцца крытычнымі і вядуць да высокай верагоднасці ўзнікнення лясных пажараў. Улады штата рэкамендавалі жыхарам устрымацца ад нетэрміновых паездак і наведвання паркаў і лясоў.

# НЕ ЗАБЫЦЦА АБ ДЭКЛАРАЦЫІ ДА ПЕРШЫХ ДЗЁН КРАСАВІКА

**Прэс-служба сталічнай падатковай інспекцыі нагадвае, што той, хто атрымліваў пэўныя даходы, што падлягаюць падаткаабкладанню, абавязаны не пазней за 1 красавіка прадставіць падатковую дэкларацыю (разлік) па падаходным падатку з фізічных асоб. Яна можа быць пададзена ў пісьмовай форме ў падатковы орган незалежна ад месца пастаноўкі на ўлік або ў электронным выглядзе праз Асабісты кабінет плацельшчыка.**

Найбольш распаўсюджанымі даходамі, пры атрыманні якіх у фізічнай асобы ўзнікае абавязак па прадстаўленні дэкларацыі, з'яўляюцца даходы, атрыманыя за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны (аплата за працу па найме, выйгрышы ў анлайн-казіно, букмекерскіх канторах, дывідэнды ад замежных кампаній, працэнты па рахунках у замежных банках і іншыя). Другімі па значнасці будуць даходы, атрыманыя ад продажу (мены) на працягу каляндарнага года аднаго аўтамабіля, агульная маса якога перавышае 3,5 тоны і (або) колькасць сядзячых месцаў якога, акрамя сядзення кіроўцы, перавышае восем, альбо двух і больш іншых механічных транспартных сродкаў. У тройцы будуць даходы, атрыманыя ад продажу (мены, рэнты) на працягу пяці гадоў двух і больш аб'ектаў нерухомай маёмасці аднаго яго віду (жылы дом, кватэра, дача, садовы домік, гараж, машына-месца, зямельны ўчастак) альбо долі ў праве ўласнасці на такую маёмасць. Гэтак жа трэба дэклараваць даходы, атрыманыя ў выніку дарэння ад фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у памеры, што перавышае 9338 беларускіх рублёў, у суме ад усіх крыніц на працягу падатковага перыяду. Выключэнне складаюць даходы, атрыманыя ад фізічных асоб, якія стаяць паміж сабой у адносінах блізкага сваяцтва або ўласцівасці апекуна, папячыцеля і падапечнага.

**Сяргей КУРКАЧ.**


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ

• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. | Минимальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инвентарным номером 134/D-3258** (наименование: **столовая**, назначение: помещение общественного питания), адрес: Брестская обл., Лунинецкий р-н, 13-1, 1,1 км северо-западнее д. Ситница, общая площадь – 865,3 кв. м | 36 278,72 | 29 022,98 |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP 30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 30 (тридцать) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 15.03.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 14.03.2024 г. до 16.00** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |



## РУП «Институт недвижимости и оценки»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении
повторного открытого аукциона
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Криница» (Продавец)**

Аукцион состоится **29.02.2024 в 11.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1: Разбраживающий танк** (складской № 70568.2).
Начальная цена с НДС 20 % – 1 440,00 руб.
Задаток – 50,00 руб.

**Лот № 2: Емкость из н/ж стали 30 ГЛ (КВ)** (складской № 70575.2).
Начальная цена с НДС 20 % – 2 580,00 руб.
Задаток – 50,00 руб.

**Лот № 3: Разбраживающий танк 1,2к.м н/ж (КВ)** (складской № 70577.3).
Начальная цена с НДС 20 % – 1 440,00 руб.
Задаток – 50,00 руб.

**Лот № 4: Разбраживающий танк 1,2к.м н/ж** (складской № 70577.4).
Начальная цена с НДС 20 % – 1 440,00 руб.
Задаток – 50,00 руб.

**Место нахождения Лотов №№ 1 – 4:**
г. Минск, ул. Радиальная, 52 (территория ОАО «Криница»).
Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – 27.02.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182



ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ

• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ (АУКЦИОНЕ)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |

**Вторые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 18.01.2024 в газете «Звязда» № 12 (300996), стр. 14**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Минимальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **1** | Помещение 3-го и 4-го этажей, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/4-2 | 598 080,00 | 299 040,00 |
| **2** | Помещение кладовой, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/4-5 | 4 032,00 | 2 016,00 |
| **Вторые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 25.01.2024 в газете «Звязда» № 17 (301001), стр. 15** | | | |
| **3** | Участок ремонта тары, корпус № 79А, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/3 | 133 536,00 | 66 768,00 |
| **4** | Насосная при 3-секционной градирне, корпус № 69Б, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/6 | 154 176,00 | 77 088,00 |
| **5** | 2-секционная градирня подземного железобетона, корпус № 69В, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/4 | 292 800,00 | 146 400,00 |
| **6** | 3-секционная градирня, корпус № 69А, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102Д/5 | 228 480,00 | 114 240,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by, и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **2 % от цены продажи лота, в случае, если цена продажи лота составит до 500 тыс. белорусских рублей, 1 % от цены продажи лота в случае, если цена продажи лота составит свыше 500 тыс. белорусских рублей в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 28.02.2024, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 14.02.2024 г. по 27.02.2024 г. до 16.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |



Организатор торгов
(ликвидатор **совместного общества с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс»**)
объявляет о проведении повторных торгов по продаже имущества в форме аукциона

| | |
|---|---|
| **Продавец** | Совместное общество с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс» |
| **Место проведения торгов** | г. Минск, ул. Лещинского, дом 12, комн. 9 |
| **Дата и время проведения торгов** | 28.02.2024 г. в 12.00 |
| **Срок подачи заявок** | Не позднее 23.02.2024 г. до 17.00 |
| **Ранее опубликованные извещения о проведении торгов** | Газета «Звязда» от 02.12.2023 № 234 (300964) |

**Предмет торгов и начальная цена**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43932, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12, общей площадью 1204,5 кв. м, наименование: главный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 3 400 000 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43933, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/1, общей площадью 721,9 кв. м, наименование: помещение мойки, кафе, административные помещения, назначение: здание многофункциональное, расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 1 900 000 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43836, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/2, общей площадью 538,4 кв. м, наименование: вспомогательный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположено на земельном участке площадью 1,1693 га на праве аренды | 1 300 000 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 500/С-60175, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12А, общей площадью 6048 кв. м, наименование: автомобильная стоянка, назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, составные части и принадлежности: автомобильная стоянка, площадка под стоянку (2), въезд, площадка под КПП, площадка под очистные сооружения, ограждение территории, ворота (2), калитка (2), расположено на земельном участке площадью 0,6048 га на праве аренды | 750 000 |

| | |
|---|---|
| **Обременения** | В отношении всех лотов – ипотека, аренда, в отношении лота № 4 – земельный участок, на котором расположен лот, подлежит изъятию для государственных нужд |
| **Порядок подачи заявок** | Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются по месту проведения торгов либо направляются по адресу: 220052, г. Минск, а/я 17 (получатель – ликвидатор СООО «Петрофф Плюс» ИП Ржеутский А.В.), со дня выхода настоящего извещения |
| **Задаток** | Задаток в размере десяти процентов от начальной цены лота перечисляется на р/с BY90 PJCB 3012 0763 3310 0000 0933 в «Приорбанк» ОАО, г. Минск, БИК PJCBBY2X, получатель – СООО «Петрофф Плюс», УНП 190861019 |
| **Условия аукциона** | Шаг аукциона: пять процентов. При признании торгов несостоявшимися, в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, и он согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, а также победитель аукциона – претендент на покупку должен заключить с продавцом договор купли-продажи в течение двух рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.<br>Оплата стоимости предмета торгов осуществляется в течение пяти банковских дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не определено договором купли-продажи. Возмещение затрат, связанных с организацией и проведением торгов, осуществляется участником, выигравшим торги, в течение пяти банковских дней со дня проведения торгов.<br>Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты их проведения.<br>Порядок проведения аукциона установлен Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 |

С дополнительной информацией можно ознакомиться
**по тел.: +375 29 667 16 72, +375 44 550 60 30.**



## ОТКАЗ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

**Государственное предприятие «МГЦН»**
**извещает об отказе от проведения 27 февраля 2024 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»** и расположенного по адресу:
Минская область, Минский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33.
Извещение о проведении торгов было опубликовано
в газете «Звязда» 06.02.2024.
Телефон для справок (017) 365-48-36.

УНП 190398583

# Мясцовае Самакіраванне

14 лютага 2024 г. № 6 (739)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# «ГЭТА ВАША БЕЛАРУСЬ!»

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з навучэнцамі гімназіі № 13 горада Мінска

**«Гэта была вельмі цікавая сустрэча, літаральна ў развіццё нарады ў кіраўніка дзяржавы, дзе Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тое, што трэба як мага больш сустракацца з моладдзю. Размаўляць, расказваць ёй усю праўду. І сённяшняя сустрэча, на мой погляд, унікальная: на ёй прысутнічалі вучні рознага ўзросту — ад чацвёртага класа да адзінаццацікласнікаў. Былі іх бацькі, настаўнікі. Мяне ўразіла шырыня пытанняў, іх глыбіня: яны датычыліся нашай гісторыі, дзяржаўнасці, перспектыў развіцця нашай краіны ў будучыні, міжнароднай палітыкі. Я ўбачыла: маладыя настолькі дапытлівыя, што мне захацелася сустрэцца з імі яшчэ раз. І гэта абавязкова адбудзецца...» — так ахарактарызавала сустрэчу Наталля Качанава.**



Фота БелТА.



Сапраўды, пытанні да Старшыні Савета Рэспублікі былі разнастайнымі, часам па-дзіцячаму непасрэднымі, а часам і зусім даросылымі. Але гэта пазней. На пачатку сустрэчы Наталля Качанава расказала гасцям пра работу верхняй палаты парламента, яе асаблівасці і прыярытэты, сярод якіх адзін з галоўных — работа з моладдзю. Прычым, па словах спікера, гэты кірунак не проста «адзін з...», а асноватворны.

«Мы многа працуем з моладдзю. Такія сустрэчы вельмі важныя для нас, яны дапамагаюць з першых вуснаў даведацца аб праблемах і пытаннях, што вас хвалююць... Сёння кіраўнік дзяржавы правёў нараду з членамі Рэспубліканскага савета рэктараў ВНУ. Хацелася б пачуць вашы думкі наконт пытанняў, што там узнімаліся. Напрыклад, аб уступнай кампаніі, выпускных экзаменах, бо, сапраўды, работа з моладдзю для нас асноватворная», — заўважыла Наталля Качанава.

Як прыклад увагі да маладых, таго, што да іх меркавання прыслухоўваюцца, Старшыня Савета Рэспублікі згадала Маладзёжны савет пры Нацыянальным сходзе, які быў створаны ў 2020 годзе. У яго склад уваходзяць прадстаўнікі працоўнай моладзі, студэнты, навучэнцы каледжаў: «Спачатку ў Маладзёжны савет уваходзілі па 10 прадстаўнікоў ад кожнай вобласці і Мінска — усяго 70 хлопчыкаў і дзяўчынак. Цяпер яго склад значна пашыраны».

Звярнула Старшыня Савета Рэспублікі ўвагу і на тое, што сёння ў краіне створаны ўсе ўмовы для самарэалізацыі, для гарманічнага развіцця асобы і прафесійнага станаўлення. Асобна спынілася яна на ролі прафарыентацыйнай работы ў школах, адзначыўшы, што сёння яна патрабуе большай актыўнасці. Бо, сапраўды, нашы ВНУ, установы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі могуць рыхтаваць спецыялістаў, якія запатрабаваны ў эканоміцы. Але пра тыя спецыяльнасці выпускнікі папросту не ведаюць. Як станоўчы момант у пытанні прафесійнага самавызначэння Наталля Качанава адзначыла той факт, што амаль 50 % дзевяцікласнікаў паступаюць у каледжы. Гэта вельмі добра для маладых людзей — яны амаль адразу акунаюцца ў будучую прафесію і ацэньваюць, наколькі правільным быў іх выбар. І калі ён не памылковы, то дарога да вышэйшай адукацыі нікому не закрыта. Такі шлях сапраўды больш эфектыўны, чым паступіць ва ўніверсітэт, а праз год-два зразумець, што «гэта не маё»...

Таксама спікер адзначыла, што наша сённяшняя краіна не з'явілася з ніадкуль. У нас багатая гісторыя, традыцыі, якія сталі моцным і трывалым падмуркам беларускай дзяржаўнасці. І іх — традыцыі і гісторыю — трэба шанаваць, трэба цаніць усё тое, што пабудавана за 30 гадоў незалежнасці. «Жыццё краіны — як жыццё сям'і. Усякае можа здарыцца, але калі ёсць павага адзін да аднаго, калі ў сям'і цэняць адзін аднаго, калі яна адзіная, то ўсё можна пераадолець і быць шчаслівымі. Так і ў краіне. Важна цаніць і берагчы тое, што маем, што стварылі. А нам ёсць што цаніць, чым ганарыцца і што бараніць...» — падкрэсліла яна.

Засяродзіла Наталля Качанава ўвагу ўдзельнікаў сустрэчы і на лічбавай гігіене, засцярогшы ад карыстання сумнеўнымі інфармацыйнымі крыніцамі. Так, сёння, у часы фэйкаў, надзвычай цяжка разабрацца, дзе праўда, а дзе хлусня. «Трэба вучыцца адрозніваць праўдзівую інфармацыю ад недакладнай. І менавіта таму нам трэба сустракацца з людзьмі, даносіць да іх аб'ектыўную інфармацыю, расказваць, да чаго мы імкнёмся і чаго хочам дасягнуць. Праводзіць такія сустрэчы, як сёння... Асабліва крыўдна і непрыемна, калі людзі з'язджаюць з краіны, якая дала ім усё, і пачынаюць з краіны, якая дала ім усё, і пачынаюць, прабачце, яе «паліваць». Так нельга, і нельга такіх слухаць. Зразумейце, хлопцы і дзяўчаты: гэта краіна ваша. Гэта ваша Беларусь! І тут вы зможаце дасягнуць усяго, аб чым марыце», — звярнулася да ўдзельнікаў сустрэчы Наталля Качанава.

Дарэчы, менавіта яе біяграфію згадаў адзін са школьнікаў як прыклад рэалізацыі магчымасцяў і імкненняў. А ўвогуле, як і адзначалася раней, пытанні былі надзвычай разнастайнымі. Так, адзін з вучняў пацікавіўся, хто са знакамітых людзей быў прыкладам для Наталлі Іванаўны.

«Калі я вучылася ў школе, для мяне і маіх аднагодкаў прыкладам былі настаўнікі, многія з якіх прайшлі Вялікую Айчынную вайну. Мяне натхнялі бацькі. Магу сказаць, што я ніколі не магла паступіць так, каб засмуціць іх. Гэтым я кіруюся і цяпер. Прыкладам для мяне быў і старэйшы брат, які паступіў у ваеннае вучылішча. У цэлым скажу, што на кожным жыццёвым этапе хтосьці цябе фарміруе, аказвае ўплыў. А калі я амаль дзесяць гадоў таму прыехала ў Мінск і стала працаваць з Прэзідэнтам, ён стаў для мяне галоўным прыкладам самаахвярнай адданасці сваёй краіне, стойкасці і сапраўднай любові да народа», — адзначыла Наталля Качанава.

Яшчэ адно пытанне датычылася даволі сур'ёзнай тэмы. Вучаніца дзясятага класа пацікавілася, якая ідэя, на думку Старшыні Савета Рэспублікі, з'яўляецца аб'яднальнай для беларусаў. «Я лічу, што фундаментам з'яўляецца наша слаўная гісторыя. Яна ў нас сапраўды гераічная. Акрамя таго, у беларусаў ёсць запыт на справядлівасць. Наогул, працуючы з Прэзідэнтам і аналізуючы яго выступленні, я вызначыла для сябе, што самае галоўнае — гэта людзі і справядлівае стаўленне да іх. Усё проста», — адказала Старшыня Савета Рэспублікі.

Былі яшчэ пытанні наконт любімых кніг і першага працоўнага месца, наконт маладзёжных ініцыятыў і важнасці гуманітарнага складніка ў прафесійнай адукацыі і шмат іншых. На ўсе іх вучні атрымалі грунтоўныя і шчырыя адказы.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

# На парадку дня — важныя сустрэчы



**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ** ў рамках мерапрыемстваў праграмы міжнароднага назірання за нечарговымі выбарамі Прэзідэнта Азербайджанскай Рэспублікі ў Баку правёў сустрэчу са Старшынёй Мілі Меджліса Азербайджанскай Рэспублікі Сагібай Гафаравай. Парламентарый перадаў словы прывітання з нагоды паспяховага правядзення выбараў Прэзідэнта Азербайджанскай Рэспублікі ад Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай, а таксама падзякаваў за запрашэнне прыняць удзел у маніторынгу.

Валерый Бельскі праінфармаваў калег аб маючай адбыцца 25 лютага 2024 г. у Беларусі важнай унутрыпалітычнай падзеі — выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання і мясцовыя Саветы дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання. Адбыўся абмен думкамі аб развіцці выбарчага заканадаўства Беларусі і Азербайджана, ролі інстытута міжнароднага назірання і неабходнасці абароны электаральнага суверэнітэту. У ходзе сустрэчы абмеркаваны шырокі спектр пытанняў двухбаковага парадку дня.

* * *

У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяны РУНЕЦ** з прадстаўнікамі працоўнага калектыву рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белдарцэнтр».

Сенатар расказала аб заканадаўчай дзейнасці парламента і прававых навацыях, маючых адбыцца выбарах дэпутатаў і адзіным дні галасавання, аб прававым статусе, парадку фарміравання і паўнамоцтвах Усебеларускага народнага сходу, аб аб'яўленні 2024 года Годам якасці і мэтавых установак кіраўніка дзяржавы па яго правядзенні.

Удзельнікі сустрэчы выказалі сваё меркаванне адносна размеркавання маладых спецыялістаў і замацавання іх на першых працоўных месцах, падрыхтоўкі дзяцей да школы, продажу зямельных участкаў і будаўніцтва жылля для маладых сем'яў.

Для гасцей была праведзена экскурсія па музейнай экспазіцыі і зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі.

* * *

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** выступіў спікерам на дыялогавай пляцоўцы са студэнтамі і выкладчыкамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У сустрэчы ўдзельнічалі каля 120 чалавек.

У сваім выступленні Сяргей Сівец акцэнтаваў увагу на законах Рэспублікі Беларусь, якія былі прыняты ў развіццё канстытуцыйнай рэформы 2022 года, найбольш значных навацыях заканадаўства, падрабязна расказаў аб рабоце Савета Рэспублікі.

Парламентарый адказаў на шматлікія пытанні, якія датычацца ролі Усебеларускага народнага сходу ў палітычным полі Рэспублікі Беларусь; адзінага дня галасавання; больш актыўнага ўцягвання ў палітычнае жыццё жанчын; узаемадзеяння Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве з дэпутацкім корпусам Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў; магчымасці заснавання новых дзяржаўных узнагарод і памятных знакаў у Рэспубліцы Беларусь у сувязі з 80-й гадавінай вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; удасканалення заканадаўства ў сферы крымінальнай адказнасці.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# «НАГЛЯДНЫ ПРЫКЛАД ПАВАГІ ДА КРАІНЫ»

## Спыталі ў сенатараў, што яны думаюць пра выбары і чаму кожнаму трэба ў іх удзельнічаць

**Сяргей АНЮХОЎСКІ, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:***

— Выбар, які мы зробім, прадугледжвае папярэднюю і дбайную падрыхтоўку кожнага грамадзяніна да электаральнай кампаніі. Таму што ў адзіны дзень галасавання выбаршчыкі сталіцы атрымаюць па два бюлетэні, абласных і раённых цэнтраў — па тры, а ў сельскай мясцовасці — па чатыры. І павінны быць гатовы выбраць людзей, якія б разумелі і падтрымлівалі аснову дзяржаўнага курсу, закладзеную Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам. Кіраўнік дзяржавы ўсіх нас арыентуе на тое, што палітыка ў аснове сваёй сёння неаддзельная ад эканомікі. Мы будуем моцную, квітнеючую Беларусь, хочам бачыць яе абароненай і быць упэўненымі ў заўтрашнім дні. Арыентуемся на мэты міру і стваральнай працы, павышэння якасці жыцця беларускага народа. Таму лічу, што дэпутатамі могуць стаць толькі сапраўдныя патрыёты сваёй краіны, якія не толькі пацвярджаюць гэтыя ідэі не толькі на словах, але і даказалі прыхільнасць ім штодзённай і ўпартай працай.

Арыенцірам пры выбары дастойных дэпутатаў для мяне таксама служаць словы Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай: «Парламентарыі, як ніхто іншы, павінны тонка адчуваць настрої грамадства, ведаць патрэбы выбаршчыкаў, своечасова рэагаваць на іх, добрасумленна і якасна працаваць на адзіную мэту — пабудова сапраўднай дзяржавы для народа, усяляк садзейнічаць далейшаму будаванню моцнай, незалежнай і квітнеючай Рэспублікі Беларусь».

**Фелікс ЯШКОЎ, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:***

— Гісторыю ствараюць людзі, і вельмі шмат у яе развіцці залежыць ад таго, наколькі свядома і адказна гэтыя людзі падыходзяць да значных яе кропак. У слова «выбары» наймагутнейшая сэнсавая нагрузка. Гэта вырашальнае ў пэўным часавым моманце вызначэнне вектара, шляху і ідэйнага падмурка — або руху наперад, або адкату назад. Таму добрыя намеры і памкненні, вернасць традыцыям, павага да дасягненняў мінулага, адказнасць і свядомасць павінны ляжаць у аснове рашэння, хто стане прадстаўляць інтарэсы народа. Тут няма месца асабістым амбіцыям, імгненным парывам, запазычаным з інтэрнэту, веры ў пустыя абяцанні і лозунгі. У аснове нашага з вамі выбару 25 лютага — адзінства поглядаў на тое, якую Беларусь мы адбудавалі разам і якую перададзім нашчадкам. Зрабіць правільны выбар — цана мірнага неба і нашай шчаслівай будучыні!

**Ала СМАЛЯК, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:***

— У адзіны дзень галасавання ўпершыню ў гісторыі суверэннай Беларусі нам трэба будзе абраць дэпутатаў усіх узроўняў. Менавіта гэтыя людзі, атрымаўшы наказ выбаршчыкаў, шмат у чым будуць уплываць на тое, у які кірунку мы будзем рухацца далей, па якім курсе будзем выбудоўваць наш шлях развіцця, які падмурак закладзём для наступных пакаленняў.

І адказнасць выбаршчыкаў каласальная. Бо важна, каб галасы былі аддадзены сапраўды дастойным людзям. Сапраўдным патрыётам, здольным прадстаўляць і адстойваць інтарэсы грамадзян, прымаць эфектыўныя рашэнні, тым, хто шчыра імкнецца да таго, каб беларусы і далей жылі ў свеце, згодзе, адзінстве, бяспецы, каб стваральнай працай прымнажаліся даброты і дасягненні.

Прыйсці на выбарчы ўчастак у адзіны дзень галасавання — значыць прадэманстраваць сваю грамадзянскую пазіцыю, актыўнасць, свядомасць, неабыякавасць да лёсу роднага краю, сваім выбарам паўплываць на яго будучыню і будучыню нашых дзяцей і ўнукаў.

**Рыгор ПРАТАСАВІЦКІ, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:***

— Якая ж роля выбаршчыка ў гэтай электаральнай кампаніі? Найперш, на мой погляд, прыйсці на выбары і зрабіць свой выбар. Гэтым дзеяннем чалавек паказвае, што яму неабыякавы лёс краіны. Прыйсці на выбары — значыць не даць нашым ворагам абнуліць эканоміку, культуру, мову, перакананні, рэлігію, пасеяць раз'яднанне ў грамадстве і знішчыць краіну, дзе жывуць нашы дзеці і ўнукі, дзе нашы бацькі. Прыйшоўшы на выбары, кожны грамадзянін яшчэ раз пацвярджае сваё грамадзянства, падкрэслівае, што ён пляціць падаткі, служыць на Узброеных Сілах, стаіць за станком, вырошчвае хлеб, вучыць дзяцей і гэтым самым сваім удзелам клапоціцца аб краіне, аб яе адзінстве.

**Тацццяна АБЕЛЬ, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:***

— Той факт, што ў адзіны дзень галасавання беларусы змогуць абраць дэпутатаў розных узроўняў, фактычна вызначыўшы кірунак развіцця краіны на найбліжэйшыя пяць гадоў, кажа пра дастатковую сталасць беларускага грамадства. 25 лютага — гэта найважнейшы дзень для кожнага беларуса, паколькі мы заўсёды стаім на перадавой дэмакратыі. Мы ўжо зрабілі Усебеларускі народны сход канстытуцыйным органам. А цяпер упарадкавалі працэс галасавання, зрабіўшы яго зручным і празрыстым. Усе дасягненні цывілізаванага дэмакратычнага свету на практыцы прымяняюцца ў Рэспубліцы Беларусь. Упэўнена, што прымаць такое сур'ёзнае рашэнне ў адзіны дзень галасавання мы будзем, як гэта і ўласціва беларусам, разам, пацвердзіўшы чарговы раз адзінства нашага народа.

**Уладзімір КАТОВІЧ, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:***

— Выбары — гэта заўсёды рух краіны наперад. Таму што народнымі выбраннікамі будуць у асноўным новыя людзі з ідэямі, пачутымі ў народа, з жаданнем зрабіць нашу краіну лепшай. Для мяне, маёй сям'і дзень выбараў — гэта свята, якое аб'ядноўвае людзей. Малодшае пакаленне ідзе за кампанію разам з дарослымі на выбарчыя ўчасткі. Дзеці бачаць, як дарослыя ўдзельнічаюць у галасаванні. Гэта адзін з этапаў фарміравання грамадзяніна — наглядны прыклад павагі да краіны.

Якім мусіць быць дэпутат новага склікання? Настойлівым, упартым, разумным, ініцыятыўным, сумленным. І галоўнае — сапраўдным патрыётам роднай Беларусі! І ўсё роўна, хто ён будзе па прафесіі: урач, дырэктар завода, настаўнік, працоўны-працаўнік, праграміст. Важна яго стаўленне да краіны і людзей.




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Юрый ДЗЯРКАЧ, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:***

— Сёння ніхто з грамадзян нашай краіны не хоча страціць мір, бяспеку, працу, якая добра аплачваецца, незалежнасць, сацыяльную абароненасць. Гэтым і тлумачыцца высокая актыўнасць жыхароў нашага рэгіёна ў электаральнай кампаніі, жаданні выбраць годных людзей, якія будуць прадстаўляць іх інтарэсы ў Саветах усіх узроўняў і Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Прыярытэтнасць кандыдатаў у дэпутаты — гэта адданасць дзяржаве, народу, высокі прафесіяналізм.

**Аляксандр ЛЯХАЎ, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:***

— Для кожнага з нас удзел у выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў і парламента — не толькі магчымасць рэальна паўплываць на лёс свайго населенага пункта, рэгіёна і ўсёй краіны, але і той важкі ўклад, які грамадзянін можа і павінен зрабіць для ўмацавання дэмакратыі, захавання міру, стабільнасці і развіцця грамадства. Цяпер у свеце склалася няпростая сітуацыя. Сучасная гісторыя і досвед паказваюць, што ў такі час без сталай грамадзянскай пазіцыі ўсяго народа, мудрасці і вытрымкі немагчыма захаваць стабільную ўнутрыпалітычную сітуацыю, незалежны курс і нават саму дзяржаўнасць.

Упэўнены, што кожны з нас павінен прыйсці на свой выбарчы ўчастак 25 лютага, а калі няма такой магчымасці, то зрабіць гэта падчас праведзення датэрміновага галасавання і аддаць свой голас за тых кандыдатаў, якіх вы лічыце дастойнымі, якія з'яўляюцца прафесіяналамі з неабыякавым сэрцам і сапраўднымі патрыётамі Беларусі.

**Тацццяна ПОЛУШКІНА, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:***

— Электаральная кампанія — заўсёды вельмі значны, важны і хвалюючы этап у жыцці дзяржавы і грамадства ў цэлым. Упершыню ў гісторыі нашай краіны пройдзе адзіны дзень галасавання, які ў адпаведнасці з патрабаваннямі абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і Выбарчага кодэкса завершыць разнастайную, шматпланавую работу дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый з грамадзянамі нашай краіны.

Думаю, што адкрытасць нашай дзяржавы і яе лідара, Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, бачанне перспектыў і развіцця краіны ў розных напрамках, вялізная інфармацыйная работа будуць садзейнічаць якаснаму правядзенню выбарчай кампаніі. Упэўнена, кожны грамадзянін нашай краіны выканае свой грамадзянскі абавязак і зробіць выбар на карысць развіцця і росквіту Рэспублікі Беларусь, міру і згоды ў грамадстве.

**Валянцін БАЙКО, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:***

— Электаральная кампанія — гэта квінтэсэнцыя ўзаемадзеяння грамадства і дзяржавы. Механізм прамога волевыяўлення дазваляе кожнаму чалавеку, кожнаму суб'екту грамадскіх адносін уплываць на грамадска-палітычнае жыццё краіны, на фарміраванне палітычнай культуры і выбудоўванне давернага дыялогу грамадства і дзяржавы. Дзякуючы электаральнай кампаніі грамадзяне краіны зробяць свой выбар, накіраваны на адзінства, стваральную працу і росквіт Беларусі, выкажуць сваё меркаванне і ўнясуць уклад у фарміраванне сістэмы каштоўнасцяў беларускага грамадства, асноўным пасылам якога з'яўляецца эканамічная і сацыяльная стабільнасць. Удзел у галасаванні — абсалютна добраахвотная справа. Але ці можа разумны чалавек ставіцца абыякава да таго, якой хоча бачыць Беларусь у будучыні, якой пакінуць яе сваім дзецям? Зрабіць свой выбар — гэта абавязак кожнага грамадзяніна. Але не толькі перад дзяржавай ці грамадствам. Гэта абавязак перад сабой, перад папярэднімі пакаленнямі беларусаў, многія з якіх аддалі жыцці за існаванне краіны, перад будучымі пакаленнямі, якія жадаюць жыць у міры, спакоі і дастатку.

**Віктар ЛІСКОВІЧ, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:***

— Удзел у выбарах — праява актыўнай грамадзянскай пазіцыі чалавека, сведчанне яго неабыякавасці да лёсу роднага краю, а таксама магчымасць прама паўплываць на лёс краіны і свайго рэгіёна.

Электаральная кампанія 2024 года стане найбуйнейшай за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі. І дзяржава зробіць усё для таго, каб забяспечыць электаральны суверэнітэт Рэспублікі Беларусь, правесці выбары-2024 спакойна, адкрыта і аб'ектыўна. А мы, выбаршчыкі, без сумневу, аддадзім свае галасы за людзей, якія ўласцівыя пачуццё высокай адказнасці, прыстойнасць, сумленнасць і прафесіяналізм у сваёй справе.

**Кацярына СЕРАФІНОВІЧ, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:***

— 25 лютага не проста адкрые новую старонку ў гісторыі сучаснай Беларусі, а прадэманструе ўсяму свету: беларусы адзіныя, яны галасуюць за сваю будучыню, будучыню сваіх дзяцей. Галоўнае — у беларусаў ёсць упэўненасць у заўтрашнім дні! Найперш таму, што кіраўніцтва нашай краіны, наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, уся вертыкаль улады, дзейнічаючы ў нацыянальных інтарэсах, самастойна вызначаюць знешнюю і ўнутраную палітыку. Упэўнена, што ў гэты сапраўды гістарычны дзень у нашых гарадах і вёсках будзе панаваць святочны настрой: такая наша беларуская традыцыя — у важныя моманты жыцця быць разам і радавацца таму, што жывём мы ў мірнай краіне, якая насуперак усім прагнозам нядобразычлівцаў упэўнена будуе сваю паспяховую будучыню.

**Аляксей КУШНАРЭНКА, *член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:***

— Кожны грамадзянін нашай краіны павінен скарыстацца сваім законным правам — прыняць удзел у выбарах дэпутатаў і паўплываць на лёс усяго беларускага народа. Падыходзячы да гэтага мерапрыемства свядома, мы прадвызначаем вектары нашага развіцця.

Галоўная задача — захаваць увесь той здабытак, які ў нас ёсць, і прымножыць яго на карысць росквіту нашай краіны, аддаючы даніну тым, хто стаяў каля вытокаў яе стварэння. Гэта наш родны дом і наш святы абавязак, завешчаны нашымі дзядамі і прадзедамі, — захаваць у ім мір і дабрабыт, стварыць неабходныя ўмовы для развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі, для дабрабыту нашых сем'яў і наступных пакаленняў беларусаў.

# «НЕ ТОЛЬКІ ТРАДЫЦЫЯ, АЛЕ І ПРАВА, І АБАВЯЗАК»

## Спыталі, з чым ідуць на выбары нашы чытачы з розных рэгіёнаў краіны

### «Гэта перш за ўсё адказнасць»

**Леанід КАЧАНАЎ, *дырэктар Слаўгарадскай сярэдняй школы № 2:***

— Гэта прамы абавязак любога грамадзяніна краіны. Уладу сапраўды трэба выбіраць. Дэпутаты мясцовага ўзроўню ў маштабах дзяржавы, магчыма, вялікай пагоды і не зробяць, але яны здольныя эфектыўна вырашаць на месцы нейкія лакальныя пытанні. У прыватнасці, гэта датычыцца добраўпарадкавання населенага пункта, дарог. Пра стан дарог наогул сёння ў раёне на кожным пасяджэнні гучыць размова. Гэта тое, што сапраўды хвалюе людзей. І яны, у тым ліку праз дэпутатаў, аб гэтым сігналізуюць. На маім прыкладзе было такое, што людзі ў зімовы час звярталіся з просьбай дапамагчы набыць сена для дамашняй жывёлы. І гэта вырашалася. Але такіх бытавых пытанняў гучыць менш, народ больш зацікаўлены ў больш значных справах....

Нельга думаць, што ад выбаршчыка нічога не залежыць. Калі нешта здараецца, чалавек падымае свае праблемы, звяртаецца і да ўлады, і да дэпутатаў. Цяпер час падтрымаць кандыдатаў у дэпутаты, выбраць менавіта самых годных і неабыякавых, якія змогуць прадстаўляць інтарэсы грамадства. Ад гэтага залежыць, якім будзе наша будучыня. Ігнараваць такую важную палітычную падзею нельга ні ў якім разе. На чале краіны знаходзіцца вельмі моцны Прэзідэнт. Моцнай павінна быць і прадстаўнічая ўлада. Выкарыстанне права зрабіць свой выбар дае кожнаму без выключэння чалавеку магчымасць удзельнічаць у працэсе кіравання дзяржавай і непасрэдна ўплываць на фарміраванне органаў улады. Вылучаючы ў парламент чалавека ад таго ці іншага рэгіёна, мы загадзя разлічваем на тое, што ён будзе агучваць нашы праблемы, выказваць думкі наконт іх вырашэння. І перш за ўсё менавіта ад пазіцыі грамадзян залежыць далейшае жыццё раёна, рэгіёна і краіны ў цэлым.

### «Нам трэба спраўдзіць давер старэйшага пакалення»

**Анастасія ДУДЗІНСКАЯ, *галоўны спецыяліст Гродзенскага гарадскога камітэта БРСМ:***

— Аб выбарах я ведала яшчэ з дзяцінства, калі разам з бацькамі хадзіла на выбарчыя ўчасткі. Мама з татам заўсёды даверялі мне апусціць бюлетэнь, і гэта было даволі хвалюючым момантам. Вельмі падабалася абстаноўка на ўчастку: іграла музыка, працаваў кафетэрый... Тады нават не ўяўляла, што і сама некалі буду выступаць на выбарчых участках. Сёння я вакалістка гродзенскай студыі «Струны сэрца». Мы выконваем сучасныя песні, якія гучаць на беларускай эстрадзе.

Мае першыя самастойныя выбары адбыліся ў студэнцкія гады, а цяпер буду прымаць удзел як малады спецыяліст. Вельмі часта гучаць словы, што моладзь — будучыня Беларусі. Старэйшае пакаленне верыць у нас, таму варта спраўдзіць гэтыя спадзяванні, а, значыць, актыўна ўдзельнічаць у электаральнай кампаніі. Для мяне асабіста пытанне інакш і не стаіць. Пакольні мы будзем выступаць з канцэртам на выбарчых участках, збіраюся прагаласаваць датэрмінова. Свой участак ведаю, буду знаёміцца з праграмай кандыдатаў. Думаю, гэта дастойныя людзі.

Сёлета мы назіраем даволі актыўную работу падчас падрыхтоўкі да выбараў. Думаю, што і самі выбаршчыкі разумеюць важнасць свайго ўдзелу ў галасаванні. Бо як жа інакш мы забяспечым сваё стабільнае і спакойнае жыццё ў нашай мірнай краіне? Пытанне далёка не рытарычнае, а канкрэтнае, на якое кожны сам павінен даць адказ. І найлепшы адказ — гэта той бюлетэнь, які чалавек апускае ў скрыню для галасавання.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

### «Іду на выбары, каб не быць у баку ад жыцця сваёй краіны»

**Зухра ТАЖЫБАЕВА, *начальнік гандлёвага аддзела ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Гомельскага раёна.***

Жыхарка Гомельскага раёна Зухра Тажыбаева родам з горада Фергана ва Узбекістане. Нарадзілася ў інтэрнацыянальнай сям'і: мама — беларуска, тата з Таджыкістана. На маміну радзіму з бацькамі Зухра прыехала, калі якраз ішла ў першы клас. Вось ужо сорак гадоў — у Беларусі. Жыве ў вёсцы Пясочная Буда Гомельскага раёна.

— На выбары мы заўжды хадзілі ўсёй сям'ёй. Як дачка была маленькая — утраіх, цяпер яна вырасла, ходзіць галасаваць сама, а мы — з мужам разам. Звычайна на вёсцы гэта цэлае свята для многіх. Дэпутатаў мясцовых нашых мы добра ведаем. Наша Пясочная Буда — тэрыторыя Грабаўскага сельсавета. У нас на вёсцы арганізаваны выбарчы ўчастак. Падрабязную інфармацыю пра кандыдатаў буду вывучаць, ужо калі прыйду на галасаванне. Бо ведаю, што як чалавек, які пражывае ў сельскай мясцовасці, буду галасаваць за дэпутата ў Палату прадстаўнікоў і абіраць дэпутатаў абласнога, раённага і сельскага ўзроўняў. У нас на прадпрыемстве арганізаваны куток выбаршчыка, дзе ёсць уся інфармацыя па адзіным дні галасавання, ёсць выданні абноўленых Канстытуцыі і Выбарчага кодэкса. Гэта вельмі зручна. Лічу, увогуле вельмі добра, што арганізаваны менавіта адзіны дзень галасавання. Я асабіста для сябе ўсвядоміла, што іду на выбары, каб таксама не быць у баку ад жыцця сваёй краіны. Хачу, каб быў мір, была работа, стабільнасць, — падзялілася Зухра Тажыбаева.

Па рабоце супрацоўніца курыруе больш чым пяцьдзясят гандлёвых пунктаў гаспадаркі і ведае, што ўсе дзяўчаты, працаўніцы яе ўчастка работы, дакладна таксама пойдуць галасаваць.

— Пойдуць з задавальненнем, асэнсавана, з разуменнем, што выконваюць свой грамадзянскі абавязак. У нас у калектыве ўвогуле так было заўсёды, — дадала жанчына.

### «Грамадзянская свядомасць — у нашай традыцыі»

**Пётр БІЛЕЦКІ, *дырэктар ААТ «Мурава» Пружанскага раёна:***

— На тэрыторыі нашай гаспадаркі традыцыйна фіксаваўся адзін з самых высокіх паказчыкаў яўкі на выбарах усіх узроўняў. Можна спытаць любога працаўніка «Муравы», чаму ён лічыць патрэбным ісці на выбары, і большасць, я ўпэўнены, скажа: каб галасаваць за стабільнасць, мір і спакой. Апошнія тры словы, відаць, і заключаюць у сабе матыў падобнай актыўнасці.

Стабільнасць краіны ў цэлым складаецца з прадпрыемстваў, што стабільна працуюць, плацяць зарплату, адлічваюць у бюджэт падаткі для функцыянавання сацыяльнай сферы. У нас менавіта такая гаспадарка: невялікая, кампактная, якая стабільна развіваецца. Апошнія дзесяцігоддзі мы дэманструем устойлівы рост асноўных паказчыкаў у галінах жывёлагадоўлі, земляробства, што дасягаецца эканамічнай палітыкай прадпрыемства, культурай вытворчасці ды стараннай работай, стаўленнем да працы кожнага члена калектыву. Як вынік работы — добрая зарплата, забяспечанне жыллём маладых працаўнікоў, упэўненасць кожнага ў заўтрашнім дні.

А каштоўнасць міру, спакою нашы людзі, як той казаў, нават уласнай скурай адчуваюць. Мы жывём на памежжы, прадстаўнікі старэйшага пакалення ездзілі туды-сюды вольна, стваралі агульныя сем'і, і ў нас пражывае нямала выхадцаў з Украіны. Таму бяду суседзяў мы асабліва востра ўспрымаем. Любая вясковая бабулька раскажа вам, як трэба быць удзячнымі за мірнае неба і чаму трэба ісці на выбары.

І яшчэ лічу, што грамадзянская свядомасць — у традыцыі беларусаў. Можна ўспомніць, як сорак, пяцьдзясят гадоў таму бацькі цяперашніх выбаршчыкаў успрымалі гэты дзень як своеасаблівае свята. Па-святочнаму апраналіся, ішлі ў сямейным складзе на выбарчыя ўчасткі, каб аддаць свой голас. Таму няма ніякай нагоды парушаць гэтую традыцыю, варта таксама выбірацца на выбары ўсёй сям'ёй. А наша гаспадарка традыцыйна дапамагае транспартам, каб падвезці выбаршчыкаў з самых аддаленых вёсак альбо даставіць членаў камісіі са скрынямі да тых, хто па ўзросце і стане здароўя не можа прыйсці на ўчастак, але жадае выканаць грамадзянскі абавязак.

### «На выбарчы ўчастак прыйду з дачкой і ўнучкай»

**Ксенія ШНІТКОЎСКАЯ, *пенсіянерка, Віцебскі раён:***

— Упершыню ў гісторыі суверэннай Беларусі выбары дэпутатаў усіх узроўняў пройдуць у фармаце адзінага дня галасавання. І калі з выбарам, за каго аддаць свой голас, нам яшчэ трэба будзе вызначыцца, то адказ на пытанне, чаму мы павінны ісці на выбары, ужо цяпер відавочны.

Мы будзем галасаваць за нашу будучыню, будучыню дзяцей і ўнукаў. Апошняе для нас, людзей пажылога ўзросту, як нішто, важна. І голас кожнага — гэта яго асабісты ўклад у стабільнасць і росквіт Беларусі. Таму і выбар павінен быць адказным і прадуманым.

Нашы правы абаронены дзяржавай. Нашым дзецям даступныя адукацыя і медыцынская дапамога, мы, пенсіянеры, атрымліваем дапамогу ад дзяржавы незалежна ад знешніх фактараў. Мы захоўваем гісторыю краіны і выхоўваем моладзь на трывалых традыцыях, ствараючы ўмовы для станаўлення і ўсебаковага развіцця маладога пакалення. Усё ў нашай краіне залежыць толькі ад нас. Мы не хочам страціць мір і спакой, незалежнасць і сацыяльную абароненасць.

Каб у нас была свая дзяржаўнасць, свае сімвалы, свабода і незалежнасць, мы павінны самі, сваімі сіламі кіраваць дзяржавай. А дэпутаты — гэта народныя выбраннікі, прадстаўнікі насельніцтва краіны, надзеленыя заканадаўчай уладай, якая дае ім права прымаць узважаныя рашэнні на карысць кожнага з нас. А гэта якасныя дарогі ў вёсцы, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, чыстая вада і шраг, можа, не глабальных, але жыццёва важных пытанняў.

Для многіх беларусаў, як і для маёй сям'і, удзел у выбарах ужо стаў добрай сямейнай традыцыяй. На выбарчы ўчастак я, як і заўсёды, прыйду разам з дачкой і ўнучкай. Такія падзеі назаўсёды застаюцца ў памяці. І гэта не толькі значная традыцыя, якой варта прытрымлівацца, але і наш абавязак і права як грамадзян краіны.

**Апытанне правялі Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# БОНУС ЗА ІДЭЮ

## У Магілёве прайшоў конкурс грамадскіх ініцыятыў

**НЕ першы год жыхары Магілёўскай вобласці разам з абласной Асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў увасабляюць у жыццё свае мары і памкненні. Актывісты пішуць праекты, ацэньваюць, якія спатрэбіцца панесці выдаткі, каго прыцягнуць да справы, і, самае галоўнае, заручаюцца згодай насельніцтва, што яно пакрые 10 % ад агульнай сумы праекта.**



Праект, які ўжо ўвасобіўся ў жыццё. Веласіпеды для сацыяльных работнікаў у Чэрыкаве.

### Прызавы фонд павялічваецца

Грамадскія ініцыятывы ў Магілёўскай вобласці рэалізуюцца з 2019 года, за гэты час атрымалася правесці з падтрымкай Асацыяцыі 206 ініцыятыў на агульную суму каля 530 тысяч рублёў. У асноўным гэта датычылася стварэння дзіцячых пляцовак, акультурвання водных крыніц, аднаўлення памятных знакаў і воінскіх пахаванняў. Асацыяцыя ўнесла 10 тысяч рублёў пры будаўніцтве мемарыяльнага комплексу ў Борках у гонар памяці аб спаленых вёсках, фінансава падтрымала праект «Нашчадкам Вялікай Перамогі», падчас якога ў кожным раёне з дапамогай насельніцтва і арганізацый стварыліся інтэрактыўныя пляцоўкі з магчымасцямі вывучаць гісторыю рэгіёна.

Добрыя традыцыі працягваюцца. Сёлета на конкурс у аблсавет паступіла 56 грамадзянскіх ініцыятыў, з якіх конкурсны адбор прайшлі 36. На працягу двух дзён ініцыятары абаранялі свае праекты перад камісіяй, якую ўзначальвае **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК.** Яна нагадала, што грамадзянскія ініцыятывы дапамагаюць фарміраваць камфортныя ўмовы жыцця на месцах і настройваюць насельніцтва на беражлівае стаўленне да ўсяго, зробленага з іх удзелам.

Сёлетні конкурс праводзіўся з навацыямі.

— Змены адбыліся пасля таго, як у Законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» быў зацверджаны механізм падтрымкі грамадзянскіх ініцыятыў, — удакладняе **дырэктар Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Паліна ЦЕРАШКОВА.** — Гэта дае магчымасць пашырыць нашы магчымасці і больш грунтоўна праводзіць гэты штогадовы адкрыты конкурс. Сёлета прызавы фонд ад рэспубліканскага і абласнога бюджэту складае 300 тысяч рублёў. Скарыстацца ім змогуць толькі сапраўды самыя народныя і запатрабаваныя ў насельніцтва ініцыятывы.



Праект, які ўжо ўвасобіўся ў жыццё.
Дзіцячы парк у аграгарадку Леніна Горацкага раёна.

### З акцэнтам на патрыятызм і гістарычную памяць

Нядзіўна, што абарона праектаў была вельмі эмацыянальнай і гарачай. Журы жадала ведаць усю паднаготную ініцыятыў і пераканацца, што за стварэннем кожнай з іх стаіць менавіта насельніцтва. Абаронцам праектаў прыйшлося вытрымліваць націск часам не вельмі простых для іх пытанняў.

Праекты датычацца добраўпарадкавання тэрыторый, арганізацыі дзіцячых і спартыўна-гульнявых пляцовак, у тым ліку для асоб з абмежаванымі магчымасцямі. Шмат хто казаў пра важную для народнай памяці дату, якую мы адзначаем сёлета, — 80-годдзе вызвалення Магілёўскай вобласці і Беларусі. У першы конкурсны дзень лідзіравалі ініцыятывы па добраўпарадкаванні месцаў воінскай славы, пахаванняў ахвяр фашызму, устаноўцы або рэканструкцыі памятных знакаў. Напрыклад, у Дрыбінскім раёне збіралі грошы на рамонт воінскага пахавання ў вёсцы Шчокатава. А ў вёсцы Вялікая Грава Асіповіцкага раёна ініцыіравалі ўстаноўку памятнага знака «Яны не вярнуліся ў родную вёску». Прадстаўніца ініцыятыўнай групы з Чавус папрасіла падтрымаць іх ідэю са стварэннем смарт-асяроддзя ў адным са шматлюдных месцаў райцэнтра. Яна прадугледжвае афармленне зоны прадметамі дзяржаўнай сімволікі, падсветку і ўстаноўку смарт-куба з QR-кодамі, праз якія можна будзе даведацца пра гістарычнае мінулае раёна, падзеі падчас Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнцаў, якія праславілі раён. Па падліках ініцыятараў, праект каштуе 26 800 рублёў. Як адзначалася, ініцыятыва не раз разглядалася на сустрэчах з жыхарамі, і яны гатовы падтрымаць яго рублём.

Жыхары аграгарадка Муравілле Касцюковіцкага раёна жадаюць адрэстаўрыраваць памятны знак у гонар Вялікай Айчыннай вайны, які з'яўляецца галоўнай славутасцю гэтага населенага пункта. Работы па рэканструкцыі знака і стварэнні новых яго элементаў ацэньваюцца ў 9970 рублёў.

Непасрэдна ў Касцюковічах збіраюцца ўвекавечыць у помніку подзвіг пагранічнікаў усіх пакаленняў. Ён стане дапаўненнем да сімвалаў памяці на Алеі Герояў па вуліцы Ленінскай. Сярод ужо існуючых — бюст байцу ПДВ, легендарнаму стваральніку і камандуючаму паветрана-дэсантных войскаў СССР, генералу арміі Васілію Маргелаву, які некаторы час жыў і вучыўся ў Касцюковічах. На думку ініцыятыўнай групы, памятны знак пагранічнікам з адпаведным кампазіцыйным афармленнем дадасць цікавасці месцу і будзе фарміраваць сярод маладога пакалення пачуццё патрыятызму і іх грамадзянскую пазіцыю.

### Месцы агульных інтарэсаў

На другім месцы па колькасці заявак — ініцыятывы, звязаныя з добраўпарадкаваннем тэрыторый, уладкаваннем дзіцячых і спартыўных пляцовак.

Шматдзетная маці з аграгарадка Гарбавічы Чавускага раёна ўжо выступала раней ініцыятарам па стварэнні дзіцячай пляцоўкі. Яна была зроблена пры фінансавай дапамозе абласной Асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Цяпер жанчына паведаміла, што людзі хочуць заняцца будаўніцтвам спартыўнай пляцоўкі. «Дзяцей у нашай школе больш чым 100, — аргументавала яна. — Нам патрэбныя валейбольнае поле і трэнажоры. Заадно пачысцім вадаём, які непадалёк. Там вельмі любяць адпачываць жыхары».

Бабруйчане выступілі з ініцыятывай добраўпарадкаваць спартыўную пляцоўку для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У Крычаве мараць пра шматпрофільную пляцоўку для катання на скейтах, роліках і веласіпедах.

У Кіраўскім раёне жыхары просяць садзейнічання ў добраўпарадкаванні дзіцячай пляцоўкі ў аграгарадку Баравіца і спартыўнай — у аграгарадку Скрыпліца.

Гучалі таксама прапановы падтрымаць з аднаўленнем гістарычнага аб'екта — храма-каплічкі ў аграгарадку Сідаравічы Магілёўскага раёна, адкрыццём інклюзіўнай экалагічнай майстэрні ў Мсціславе, дапамагчы з рэканструкцыяй гарадскога пляжа ў Чавусах, уладкавання дзіцячай пляцоўкі ў аграгарадку Новыя Максімавічы Клічаўскага раёна.

Вельмі актыўнае насельніцтва жыве ў аграгарадку Падсолтава Мсціслаўскага раёна. Тут ужо сабралі 300 рублёў на аднаўленне крынічкі. Гэта нават болей чым 10 % ад агульнай сумы — 2565 рублёў — кошту ініцыятывы. Дарэчы, насельніцтва аграгарадка штогод рэалізоўвае па некалькі грамадскіх ініцыятыў. Населены пункт знакаміты слаўнай гісторыяй, яму 575 гадоў.

### Ініцыятывы з размахам

Некалькі раёнаў заявілі вельмі маштабныя ініцыятывы, якія не абмяжоўваюцца адным дворыкам ці мікразонай. Напрыклад, жыхары вёскі Мурын Бор Касцюковіцкага раёна пажадалі з дапамогай Асацыяцыі мадэрнізаваць абедзенную залу ў сваёй школе. Іх праект мае на ўвазе замену сталовай мэблі, вокнаў, устаноўку інфармацыйных стэндаў для прапаганды здаровага харчавання, касметычны рамонт памяшкання. Цана пытання 7991 рубель.

Ініцыятыўная група ад Чавус прапанавала правесці рэнавацыю прыпыначных павільёнаў і зрабіць іх зачыненага тыпу з антывандальнымі прыстасаваннямі, камерамі відэаназірання, велапаркоўкамі і гэтак далей. Усё гэта ацэньваецца ў 109 тысяч рублёў. Адпаведна, узнос ад насельніцтва павінен скласці каля 11 тысяч рублёў. Ініцыятары ўпэўнены, што жыхары іх падтрымаюць.

Яшчэ адна чавуская ініцыятыва датычылася стварэння шасці закрытых кантэйнерных пляцовак. На думку яе распрацоўшчыкаў, так будзе больш эстэтычна і экалагічна. Кошт адной пляцоўкі, дарэчы, 16 583 рублі.

Нятаннымі атрымаліся ініцыятывы турыстычнага фармату. У Чавускім раёне мараць зрабіць яшчэ больш цікавым фестываль «У госці да радзімічаў». Фестываль эпохі ранняга Сярэднявечча, які праводзіцца на тэрыторыі аграгарадка Радамля, летась адзначыў сваё 10-годдзе. На мерапрыемства збіраецца шмат гасцей, якім цікава даведацца, як жылі радзімічы. Свята праводзіцца на старажытным гарадзішчы. У 2019 годзе праект быў адзначаны грантам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, што дало магчымасць удасканаліць базу для правядзення гэтага мерапрыемства, стварыць музей пад адкрытым небам і іншыя цікавыя аб'екты. Але, як лічаць удзельнікі ініцыятыўнай групы, тут патрэбна яшчэ пабудаваць кузні, сярэднявечную браму, сцэну, навесы для майстроў і гэтак далей на агульную суму 65 тысяч рублёў.

Старажытны Слаўгарад таксама прапаноўвае павысіць цікавасць да горада шляхам развіцця яго турыстычнага патэнцыялу. Прадстаўнікі мясцовага Маладзёжнага парламента выступілі з праектамі па развіцці паркавай зоны ў раёне старажытнага парку і стварэнні набярэжнай на папулярным месцы адпачынку, дзе зліваюцца дзве ракі Сож і Проня. Першая ініцыятыва ацэнена ў 122 тысячы рублёў, другая — у 88 тысяч рублёў.

Усе праекты цудоўныя і патрэбныя, але, як нагадалі арганізатары, па ўмовах конкурсу яны павінны быць рэалізаваны за кароткі тэрмін — на працягу года. І каб насельніцтва прагаласавала за іх рублём. Немалаважна таксама ведаць, хто потым возьме «народны» аб'ект на сваё ўтрыманне.

Як стала вядома, пераможцамі конкурсу грамадскіх ініцыятыў сталі 13 ініцыятыў. Сярод пераможцаў — праекты з Краснаполля, два — з Бабруйска, Шклова, Крычава, Слаўгарада, Быхаўскага, Дрыбінскага, Шклоўскага, Чавускага і два — з Кіраўскага раёнаў. Тэмы — добраўпарадкаванне, рамонт помнікаў і ўстаноўка памятных знакаў, спартыўныя пляцоўкі, развіццё старадаўняга парку і выданне кнігі ваенных мемуараў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з сайта as-deputatov.by**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.985. Нумар падпісаны ў 19.30 13 лютага 2024 года.**

# «У ЗАМКУ РАГАЧЫКСКІМ ФІЛОСАФ ВЯЛІКІ»

## Самыя загадкавыя творы беларускай літаратуры

**Чытач любіць загадкі.**
**І гэта датычыцца не толькі дэтэктываў ды містыкі. У гісторыі літаратуры ёсць творы самых розных жанраў, над загадкамі якіх дасюль б'юцца і звычайныя чытачы, і літаратуразнаўцы. Што хацеў сказаць аўтар? Хто гэты аўтар? Калі і дзе напісаны твор, што ў ім зашыфравана? Творы-таямніцы маюцца і ў беларускай літаратуры. Давайце згадаем некаторыя з іх...**

### НЕВЯДОМАЯ АДЭЛЯ

Паэму «Мачаха» ў 1970 годзе адшукаў у архівах літаратуразнаўца Адам Мальдзіс. На рукапісе быў пазначаны год стварэння — 1850, а адметным было тое, што напісаны твор на беларускай мове. Значылася імя аўтара — «Адэля з Устроні». У паэме адгукаўся беларускі фальклор:

*«Па зямлі віхор пагнаўся,*
*З буйным ветрам паспіраўся.*
*Віхар туманочкам ляцеў,*
*Чорну буру відзець хацеў.*
*Бура да Нёмана хадзіла*
*І чысту воду муціла,*
*І з беражочка ў беражочак*
*Калыхала ўвесь Нямночык.*
*Сваей нотай зарыкнула,*
*На бяседу заклікнула:*
*«Туманы! Цёмныя хмары!*
*І ты, круты віхар у пары!*
*На бяседу прыляціце*
*Дый на мяне паглядзіце,*
*Бо сягоння праз рэчаньку*
*Будзе плысці ў чоўньньку*
*Дзяцюк, што смеў пахваліцца:*
*«Ён... мне, чорнай, не баіцца!»*

Дзяцюк, які згадваецца ў паэме, плыве не проста праз бурлівы Нёман, а да сваёй каханай. Прычым уся родная зямля яго падтрымлівае: і бор не дае чужому ветру дзьмуць, і Нёман не жадае тапіць свайго... Але чужы, насланы злой воляй вецер не сунімаецца... У каханай дзецюка таксама праблемы: яна жыве з мачахай, а мачаха не жаніха ненавідзіць, «у лыжцы вады патапіла б». Мы можам толькі здагадвацца, што буру выклікала менавіта мачаха. Гэтак жа толькі здагадваемся, што адбылося з закаханымі, бо паэма абрываецца. Ці пераплыў адважны хлопец Нёман, ці сустрэўся з дзяўчынай, ці была пакараная мачаха? Ці ўсё адбылося, як у антычным міфе пра Геро і Леандра, які таксама пераплываў дзеля спаткання бурлівы Геляспонт і патануў, а каханая не вытрымала гэтага і таксама памерла?

Гадалі навукоўцы і наконт таго, хто хаваўся пад псеўданімам «Адэля з Устроні»: бо толькі ў Ганчарскай воласці Лідскага павета на пачатку ХХ стагоддзя мелася 20 Устроняў. Найбольш папулярная сёння тэорыя, што Адэляй была Габрыэля Пузыня з графскага роду Гюнтэраў, таленавітая пісьменніца, заснавальніца мастацкага салона і аматарка беларускага фальклору. Ну, і сэнсы разгадваць: мо ў паэме нешта аўтабіяграфічнае, мо зашыфраваны тагачасныя грамадскія падзеі...

### ЦЕНІ І СІМВАЛЫ

*«Лірнік Лазар ходзіць, плача,*
*І ніхто яго не бача.*
*Не прыходзіць змілаванне*
*З важнай весцю ў добрым стане...»*

Яшчэ адзін загадкавы твор беларускай літаратуры — гэта, безумоўна, паэма «Сон на кургане» Янкі Купалы. Расшыфроўваюць яе літаратуразнаўцы, расшыфроўваюць, ды да канца не здолелі. Іван Навуменка, напрыклад, у гісторыі пра хлапца па імені Сам, які заснуў на кургане, пабачыў у сне ўсялякіх міфічных пачвараў, русалак, відмаў ды містычнага Чорнага, а потым быў аблудна абвінавачаны ў падпале вёскі, угледзеў «роздум аўтара пра гістарычнае мінулае народа». Сучасны даследчык Валерый Максімовіч кажа пра «сімвал душы, якая пазбягае стыхійных неўтаймаваных жаданняў, а Сам вызначаецца як герой ніцшэанаўскага тыпу».

Зразумець, што хацеў сказаць малады Купала, можна, паглыбіўшыся ў кантэкст эпохі. Іван Дамінікавіч тады жыў у Санкт-Пецярбургу, дзе віравала мастацкае жыццё — ар-нуво, сімвалісты... Станіслаўскі ставіць Ібсена, Метэрлінка і Леаніда Андрэева... Вячаслаў Іванаў збірае ў сваёй «вежы» паэтаў, сярод якіх Андрэй Белы і Велімір Хлебнікаў. Выходзіць часопіс «Мир искусства», цалкам прысвечаны сімвалізму, інтэлігенцыя збіраецца на спірытычныя сеансы...




Зразумела, Купала не мог застацца ў баку ад агульных павеваў, яго «Чорны» годна становіцца ў шэраг «Чорных чалавекаў» літаратуры таго часу, бязвінна асуджаны Сам, які безнадзейна паўтарае «Ратаваці бег з папару Усіх чыста ад пажару...», ды яго ніхто не слухае. Нават тое, што ў апошнім дзеянні, якое адбываецца ў Шынкоўні, Сам сядзіць за сёмым столікам, лічаць невыпадковым — лічба ж сакральная. Карацей, усё жыццё ёсць сон.

### ТЭЛЕПАРТАЦЫЯ І АТАМІР

*«Дужы, агніста-рыжы арангутанг біў валасатымі кулакамі сабе ў грудзі».*

Менавіта так, са сцэны ў Берлінскім заапарку, пачынаецца адзін з першых фантастычных твораў беларускай літаратуры — раман Змітрака Астапенкі «Вызваленне сілаў». Першая яго частка была надрукавана ў 1932 годзе ў часопісе «Маладняк». Другая... так ніколі і не выйшла.

Загадкавай была сама асоба аўтара: малады пісьменнік сцвярджаў, што можа ў думках падарожнічаць па любым месцы Зямлі, і прапаноўваў сябру Яну Скрыгану: «Хочаш, я нарысую табе план любой сталіцы свету, з назвамі плошчаў, вуліц?» Аднойчы, калі Скрыган прыйшоў да яго ў госці, заявіў: «Зараз рассунуцца сцены, і ты ўбачыш усіх жыхароў гэтага дома, можа, каторага нават за не вельмі прыстойным заняткам. Хочаш?» І патлумачыў,



што зрабіў вялікае адкрыццё: «Разгадаў таямніцу жыцця матэрыі, і ў маіх руках цяпер вельмі страшная сіла. Я магу ў любым парадку сінтэзаваць атамы, а значыць, маёй волі няма канца. Магу ўсюды быць, усё знаць, усё бачыць, лёгка разбураць усё тое, што чалавеку на шкоду, і гэтак жа лёгка аднаўляць».

Праўда, заўважыў, што гэткая вера ў свае надзвычайныя здольнасці яму патрэбная для напісання фантастычага рамана.

У «Вызваленні сілаў» Астапенка сапраўды вельмі яскрава і падрабязна, хоць ніколі там не быў, апісвае Берлін, яго вуліцы, паркі, кавярні. Галоўны герой — савецкі інжынер Валер Богуш — працуе ў Германіі па абмене. Да яго трапляе сшытак, знойдзены калісь у беларускім касцёле на Палессі. У сшытку — сакрэт «атамнага апарату вызвалення ўнутрыатамнай энергіі». Невядомы навуковец апісвае эксперыменты, падчас якіх утвараліся «тонкія праменні блакітнага колеру, якія без перашкод праходзілі праз метал і дрэва, ператваралі ў попел жывую матэрыю». Далей ідзе змаганне за авалоданне таямніцай «атаміра» — атамнага апарата, Валер Богуш супрацьстаіць хцівым і жорсткім капіталістам. А каб здабыць рэшту папер, Богушу належыць прабрацца ў Заходнюю Беларусь, акупаваную Польшчай...

Мы так і не даведаемся, чым скончацца пошукі Валера Богуша. Астапенка быў арыштаваны, рукапісы канфіскаваны. З сібірскіх лагераў падчас вайны патрапіў у спецатрад — ці не з-за сваіх асаблівых здольнасцяў? Знік падчас аперацыі ў Татрах... Хоць Аркадзь Куляшоў сцвярджаў, што бачыў яго пасля вайны ў Маскве.

### КІТАЙСКАЯ ЛЕГЕНДА

6 кастрычніка 1925 года Уладзімір Дубоўка, дваццаціпяцігадовы беларускі паэт, які толькі што выйшаў з літаб'яднання «Маладняк» і стварыў з некалькімі сябрамі суполку «Узвышша», піша верш «Апошняя песня». Твор невялікі, працытуем яго цалкам:

*«І было увосень, калі стрыглі поле*
*і на полі слалі дываны з лістоў.*
*Зашчымела сэрца*
*ў нечуваным болю:*
*вельмі многа крыўды,*
*вельмі мала слоў.*

*І было увосень... Я сказаў аднойчы:*
*больш не дакрануцца пальцы мае*
*струн.*
*І пайду да мэты,*
*сцяўшы зубы, моўчкі,*
*і назад не гляну,*
*як Ван Чжаоцзюнь.*

*І было увосень...*
*Я сказаў на ростань:*
*тое, што звінела,*
*больш няма таго.*
*І апошняй песні завілася постаць:*
*жыватворчы праглынуў агонь».*

Заўважылі, што ў вершы раптам згадваецца кітайскі персанаж — Ван Чжаоцзюнь? Дубоўка для неабазнанага чытача тлумачыць: *«Ван Чжаоцзюнь — дзяўчына, кітаянка. Жыла ў 30—40-я г.г. пачатку нашае эры. Вылучалася нязвычайнай прыгажосцю. Шмат кітайскіх паэтаў ахвяравалі ёй свае вершы, звязаныя з яе, адносна, трагічным жыццём».*

Патлумачым падрабязней: Ван Чжаоцзюнь была наложніцай кітайскага імператара, але адмовілася даць хабар мастаку, які павінен быў пакаазаць яе партрэт імператару. Таму мастак намаляваў яе страшненькай, і імператар не захацеў яе бачыць і аддаў праваднуру гунаў. Але і на чужыне Ван Чжаоцзюнь змагла заваяваць любоў і павагу, і дзякуючы ёй, суайчыннікі яе мужа не ўчынялі набегі на яе радзіму, бо і на чужыне дзяўчына любіла родны край і распаўсюджвала яго культуру.



Тэма Кітая ў 1920-х была папулярнай на Беларусі — навіны з далёкай усходняй краіны пра рэвалюцыйныя падзеі друкаваліся ў беларускай прэсе, паэты перакладалі вершы. Да кітайскай культуры Дубоўка мог далучыцца і ў Маскве, дзе тады жыў — у 1923 г. выйшла ў перакладзе на рускую мову кніга паэта Го-Мажо, у творах якога якраз і згадвалася прыгажуня Ван Чжаоцзюнь, у 1925 г. з'явілася кніга чатырохрадкоўяў Лі Бо з вершам пра тую ж гераіню.

Літаратуразнаўцы ўглядаюцца ў вобразе Ван Чжаоцзюнь параўнанне з Беларуссю... Але чаму б не ўявіць, што ў вершы Дубоўка апісвае свае пачуцці ад развітання з «Маладняком», дзе засталося шмат сяброў і шмат добрых успамінаў, дзе было перажыта і шмат крыўдаў. І вось паэт пад чужыя кпіны ідзе на «Узвышша», да новай беларускай літаратуры, «сцяўшы зубы, моўчкі, і назад не гляну, як Ван Чжаоцзюнь».

### ШЛЯХАМІ ФАЎСТА

*«— Дай руку, друг, — хачу я сказаць. — Я паведу цябе далёка, у XVI стагоддзе. Я пакажу табе д'ябальскія падкопы і сонечныя ўсмешкі чалавечых вачэй, бязодні подласці і высакароднасці, нянавісці і любові. Таму што нават тады свяціла сонца і зрэдку не з шыбеніц раслі на зямлі лясы...»*

У творах Уладзіміра Караткевіча шмат загадак... Але давайце ўспомнім, можа, быць, самы загадкавы і малавядомы твор — «Легенду аб бедным д'ябле і адвакатах Сатаны», *«аб Рогачы, д'ябле, што з пекла быў выгнаны, як Арый завушаны з Нікейскага сабору, і стаў чалавекам, і, забыўшы каханне, у зламысьнасці і падступным забыцці, стаў каралём і, у брыдкай ерасі прабываючы, забыў шыпшыну і змяю, што трымае сябе за хвост — знак, што нікому з брэнных не перайсці мяжы Бясконцага... А легенду тую з вуснаў і кніг пераклаў і запісаў у замку Рагачыкскім філосаф вялікі, кнігалюб, думак ваявода і сын ваяводкі, пан Уладак княж Сымонаў сын Караткевічаў, беларускія і іншыя элаквенцыі знаўца, чалавек не толькі ў беларускіх, але і ў лацінскіх, і ва ўсякіх іншых пісьмёнах пісьменны і абазнаны».*

Твор гэты Караткевіч напісаў у 1961 годзе. Час, калі ён вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах і сцэнарных курсах у Маскве і прагна далучаўся да інтэлектуальных скарбаў. Тады ж зрабіў па «Легендзе» і сцэнарый фільма... Але твор дайшоў да публікі толькі ў 1994-м, калі аўтара не было ў жывых. Занадта востра гучала «Легенда», занадта шмат узнікала алюзій і параўнанняў... Чытаючы, успамінаеш і стыль Рабле, і «Боскую камедыю», да якой ёсць прамыя адсылкі, і, зразумела, «Фаўста» Гётэ. Замахнуўся малады аўтар грандыёзна... Паказаць і Беларусь, і чалавецтва ўвогуле, і само ўладкаванне Сусвету. Сустракаем і ўлюбёную караткевічаву схему дваістага кахання — наіўныя згубнай і жанчыны-ратавальніцы з адным абліччам. Выгнаны за міласэрнасць з пекла д'ябал Андрэй Рогач пакахаў простую дзяўчыну Дубраўку і захацеў стаць чалавекам, але яму сцерлі памяць, і Рогач захапіўся іншай жанчынай з абліччам Дубраўкі — бязлітасная каралевай Агатай. Акрамя Рогача, для якога не існуе часу — бо ён бачыў і мінулае чалавецтва, і будучыню — сярод людзей жывуць такія ж засланцы з пекла і пазнаюць адзін аднаго па тым, што ў шасцаццатым стагоддзі могуць пагутарыць пра Ніцшэ ці вадародную бомбу. Твор відавочна недаацэнены, які змушае думаць і ўглядацца ў жыццё.

Падумайце ж над загадкамі беларускай літаратуры і вы, шаноўныя чытачы!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**



# ВЕК ЖЫВІ — ВЕК ВУЧЫСЯ

## ТАМУ, ЯК НАЛЕЖЫЛА Б ЖЫЦЬ

**Што было — было: у Аўцюках каля крамы аднаму чалавеку нядобра стала — прытомнасць страціў. Людзі, вядома ж, да яго, абступілі:**
**— Вады! — нехта крычыць.**
**— Таблетку пад язык!**
**— Выклікайце «хуткую»...**
**— Дайце яму віна, — сказала бабка Маня.**
**Хворы, пачуўшы гэта, варухнуў брывом, расплюшчыў вока, ледзь чутна прашаптаў: «Эй вы... Усе... Заткніцеся... Паслухайце, што бабця кажа».**
**І сапраўды: яно ж грэх не паслухаць, бо чараўніца — не інакш: з таго свету чалавека вярнула — адным толькі словам!**
**Во якім дужым яно бывае!**

### Спадарожнік

Сталіца. Нядзеля. Метро. Справа ад ўвахода лаўка — тры месцы і ўсе незанятыя. Значыць, можна сесці, пачытаць, краем вока заўважыць, што паводдаль прымасцілася танклявае дзяўчо, а паміж намі — праз станцыю — «плюхнуўся» дзяцюк ды такі здаравенны... Не тое, што чытаць, — дыхаць нельга...

Не без цяжкасцяў выбралася са свайго кутка, дзяўчо — таксама: сталі побач... Мужчына, што называецца, вокам не міргнуў: разваліўся, заняў усю лаву! Што здзівіла — аніякіх комплексаў у чалавека накшт пуза і шырыні сваёй пятай кропкі, накшт таго, што выцісну іншых — двух, слабейшага полу...

А галоўнае, каб хоць ехаў далёка, — праз станцыю выйшаў.

Памяць пакінуў — спадарожнік.

### Вось такое кіно...

Маеш дачку — май гарэлку ў глячку. Прымаўку гэту бацькі ведалі і з кожнай зарплаты, хай пакрысе, адкладвалі грошы — на шлюбную сукенку і добры падарунак, на само вяселле... Хацелася тады — адна ж дачушка — зладзіць маладым прыгожае свята, сабраць радню, пагуляць, зняць на памяць кіно...

Да яго, як здавалася, рукою падаць: з'явіўся жаніх, што-нішто пра яго бацькі ўжо чулі, а тут...

Дачка прынесла білеты ў тэатр, папрасіла прыйсці на паўгадзінкі раней, каля ўвахода сустрэла — правяла да століка з шампанскім.

Там жа праз хвіліну-другую з'явіўся малады чалавек.

— Пазнаёмцеся, гэта Саша, мой муж, — аб'явіла дачка. — Сёння мы распісаліся.

— ?!

...Бацькі, здаецца, павіншавалі? Напэўна ж, выпілі... Пра нешта гаварылі... Потым глядзелі на сцэну...

Што там паказвалі, ні бацька, ні маці, ні ў той вечар, ні назаўтра — успомніць не змаглі.

### Пытанне

З размовы мужчын: «Цяпер у модзе жаночая эмансіпацыя». — «А гэта што такое?» — «Сяло... Гэта калі жанчыны змагаюцца за свае правы». — «Калі жанчыны змагаюцца за свае правы, — гэта экзамены ў ДАІ».

З тэлефоннай размовы на прыпынку вечарам: «Не, мама, ваджэнне я не здала... Чаму-чаму? Дык жа цёмна: дзе там газ, дзе тормаз, — ні халеры не відаць!»

Надпіс на школьным сшытку: «Ведаў у мяне — не адабраць! Чаго няма — таго няма!»

Пра сябе ці не, але шчыра.

### Стымул?

Горад, базар — стары... А вось прадаўцы дзе-нідзе ўжо новыя. Адзін досыць цікава сала прадае: злева ад вагаў тавар, справа — талерка з добрым дзясяткам маленькіх бутэрбродаў на шпажках. Падыходзь, маўляў, пакаштуй! Не спадабаецца — ідзі далей, альбо...

Іншага тут, мусіць, не дадзена: ці не кожны, хто каштуе, адразу ж займае чаргу. Значыць, і нам грэх не пастаяць крыху і ўжо на падступах грэх не пазваніць сябрам, не спытаць, ці не ўзяць з кілаграмчык ім?

— Калі добрае, чаму ж не! — чуем у адказ (і не толькі мы).

— Тады нам — два, — кажам прадаўцу.

У тога рука, відаць, набітая: спрытна адразае кіло (нібы ў аптэцы — грам у грам), потым яшчэ адно, спрытна кладзе ў два пакеты, бярэ нашы 44 рублі, 4 — тут жа вяртае.

— Навошта? — не разумеем. — Вунь жа цэннік — 22 за кілаграм.

— А я беларускамоўным знiжку раблю.

...Дробязь, як той казаў, а прыемная! Мы дзякуем чалавеку, ён — нам, разыходзімся амаль сябрамі!

Чарга застаецца: як выглядае, трохі разгубленай і заклапочанай — у прыватнасці, пошукам беларускіх слоў, што былі б дарэчы.

### Як ёсць

Жылі-былі...

З гэтых слоў пачынаюцца не толькі казкі, але і... тосты.

Значыць, жылі-былі тры дзяўчынкі-равесніцы. Разам хадзілі ў дзіцячы садок, потым у школу, разам здавалі экзамены, бегалі на танцы, адзначалі святы. І вось — Новы год, дваццаць першы ў іх жыцці. «Дзесяць мінулых мы пражылі цяжкавата, — кажа самая гаваркая. — Закачвалі школу, выбіралі прафесіі, здавалі выпускныя і ўступныя экзамены, прайшлі праз першыя каханні... Затое цяпер... Жывём, сяброўчачкі! Наступныя дзесяць гадоў павінны быць лягчэйшымі!»

І вось яны прайшлі (ці праляцелі?), дзяўчаты зноў сабраліся за сталом, і зноў самая гаваркая цяжка ўздыхнула-сказала: «Божухна, якія ж няпростыя гэтыя дзесяць... Мы вучыліся (яшчэ і працавалі), выходзілі замуж, туліліся ў здымных кватэрах, сыходзілі ў дэкрэты, нараджалі, улазілі ў крэдыты, будавалі жыллё, грошай катастрафічна не хапала, малыя хварэлі... Затое цяпер...

Праз наступныя дзесяць (вы здагадаліся?) жанчыны зноў сустрэліся і зноў пры-



зналі прыкладна тое ж, бо пастарэлі іхнія бацькі, бо з падрослымі дзецьмі праблем было яшчэ больш, чым з малымі, бо з'явіліся хваробы ў саміх, бо мужы... У адной папіваў, у другой пагульваў, у трэцяй не было зусім... Бо грошай па-ранейшаму не хапала... Затое ў наступныя дзесяць...

Сяброўкі былі аптымісткамі, спадзяваліся на лепшае: на тое, што некалі ж пачнецца тая светлая паласа, калі ўсё ў іх стане... Ну як у адной Аліны.

...А ў той не жыццё, а сто дваццаць «але»: у школе вучылася добра, але ў інстытут не паступіла. Замуж выйшла рана, але праз два гады муж сышоў. Аліментаў не плаціў, але пакінуў кватэру — адзін невялічкі пакой (затое кухня — аж дзевяць метраў!).

Хацелася ў ёй нешта гатаваць (пажадана смачнае) — і сабе, і дзіцяці, але грошай часцяком не было, таму Аля (ад паўгода малой) пайшла працаваць — прыбіральшчыцай, але там плацілі... Ды і графік — тое, што трэба: пару гадзін рана ранічкай, пару — увечары, а ўвесь дзень свабодны, і яны з малой чаго ні рабілі, чым ні займаліся: маляваннем, плаваннем, музыкай, гімнастыкай, танцамі...

А паралельна Аля скончыла курсы кройкі і шыцця, сабе, дачцэ і на продаж шыла-вязала прыгожыя рэчы, сачыла за сабой, шмат чытала...

Быў час — сустрэла мужчыну, пакахала і ведала, што гэта ўзаемна, але...

Ён быў жанаты. Як чалавек прыстойны, хацеў, збіраўся развесціся, пакінуць жонку... Сына — не мог: увесь час адкладваў, жыў, можна сказаць, «на два дамы», нерваваўся і першы інфаркт яшчэ перанёс, а вось другі...

Пасля гэтага ніякіх раманаў у Алі не было, а яшчэ і таму, што свае пачыналіся ў дачкі: у 17 яна закахалася, у 18 выйшла замуж (дакладней, ён, муж, пераехаў да іх), канапку для Аліны паставілі ў кухні: дзевяць метраў, можна! І нават добра, бо зяць аказаўся чалавекам справы: шмат працаваў і зарабляў, у прыгарадзе, у адным з так званых царскіх сёлаў, узяўся дом будаваць (участак атрымаў у спадчыну)... Да таго ж у сям'і хутка з'явіўся першынец...

Жыць у ранейшай аднапакаёвай кватэры ім, ну вядома ж, цяжкавата было, але сыходзіць на прыватную, аддаваць камусьці (прычым штомесяц!) такія патрэбныя грошы яны не хацелі: стараліся адзін аднаму дапамагаць, узгадоўваць, ладзіць... Нават тады, калі ў сям'і з'явіўся яшчэ адзін хлопчык і яшчэ адна дзяўчынка.

...Летась шматдзетная сям'я пераехала ў асобную прасторную кватэру — абсталяваную па апошнім слове тэхнікі.

Але гэта — не ўсё: грошай, якія яны разам стараліся зарабляць ды эканоміць, хапіла яшчэ і на тое, каб за гэтыя гады падагнаць работы на будаўніцтве дома. Ён ужо з дахам, з вокнамі-дзвярыма, з асобнымі пакоямі для кожнага з сямейнікаў і найлепшым (сама выбірала!) — для цёшчы.

...У сваёй аднапакаёвай (зяць пасля высялення «ўклаўся» ў вельмі прыстойны рамонт) яна цяпер адна, але, вядома ж, не адзінокая: у яе вялікая дружная сям'я, верныя сяброўкі, швейная машынка і наперадзе — як усе спадзяюцца — яшчэ многа часу. Без розных там «але».

Што датычыцца мінулага, дык усё, вядома, магло быць лепш! А магло і горш.

### Кароткае слова...

«ПРОДАЕТСЯ!» — на вокнах, балконах, лоджыях кватэр...

Упершыню такія абвесткі (па-руску, з нумарамі тэлефонаў, літары-лічбы з арцын) некалі даўно бачылі ў Балгарыі. Цяпер іх нямала ў нас: прадаецца, напрыклад, кватэра ў цэнтры сталіцы. І, напэўна ж, нятанна, бо побач — плошча Перамогі, метро, бо... з вокнамі на «Мір».

Насупраць — кінатэатр, толькі і ўсяго... Ці не толькі?

### Пошук

Студзень. Снег. Ён жа — шанц (паводле анекдота) для мужчын зляпіць сабе бабу. На ўласны густ.

Не лепяць, што толку — са снежнай? Да таго ж — гэта ўжо было. Бог (па новай версіі) стварыў не аднаго Адама, а цэлых... дзесяць! Потым, каб не сумавалі, прынёс ім гліны і цукру, сказаў, што з іх кожны можа зляпіць жонку.

Мужчыны згадзіліся і вельмі стараліся: кожны ляпіў сваю, для сябе, з дабаўленнем слодычы... Бог, «прымаючы работу», гэта ацаніў. А ўголас яшчэ і заўважыў, што цукру было адзінаццаць кавалачкаў, а не дзесяць. Значыць, нехта з мужоў паклаў у свой «выраб» два?

Высвятляць, каторы (і ў каторую з жанчын), часу не было і, як быццам, патрэбы? Але ж пытанне «павісла». І з той самай пары дзевяць мужоў з дзесяці перабіраюць жанок — шукаюць тую, самую салодкую.

І толькі адзін з іх гэтага не робіць. Ён дакладна ведае, што на слодыч усе жанчыны роўныя, бо той, дадатковы драбочак цукру, ён проста з'еў.

### Грош такі...

«Наш зяць — як лётчык: на зямлі ад яго ніякай карысці», — казала суседкам цешча, бо ў сям'ю, якая ўсё жыццё штось будавала, рамантавала, абнаўляла, прыйшоў акулярык, які ўмеў хіба нож трымаць у правай руцэ, а відэлец — у левай... Усё астатняе (малаток, рыдлёўка, сякера, нажоўка) валіліся — то ў самым нечаканым месцы, то ў самы недарэчны момант!

Спачатку гэтыя «прыгоды» не маглі не смяшыць. Потым, як і варта было чакаць, сталі раздражняць. Цешча ўсё часцей называла зяця хадзячым непаразуменнем, цесць намякаў, што ён «халяўшчык», жонка ўсё радзей і радзей пярэчыла. І, магчыма, сапраўды падала б на развод, калі б...

Калі б гэты «акулярык» раптам не змяніў работу і не стаў зарабляць, як той самы лётчык!

...І ндзе ж не дзелася — запаважала чалавека цешча.

І не фанабэрыцца болей цесць. І цяжарнаю ходзіць жонка.

### Век жыві...

Ранак, трамвай, на чарговым прыпынку ў салон падымаюцца дзеці — падобна, другакласнікі, чалавек мо з дваццаць...

Кіроўца чакае, пакуль яны зойдуць (усе ў адны дзверы), пакуль размесцяцца на заднюю пляцоўцы, пакуль па загадзе настаўніц, за нешта ўчэпяцца... Далей — вольніца: дзяўчынкі аб нечым шэпчуцца паміж сабой, хлопчыкі папрыліпалі да задняга шкла — сочаць за рухам машын, уголас (і гучна!) «варожаць», якая з іх дагоніць трамвай, а якая не?

— Міліцэйская? Зараз!

— «Хуткая»? Лёгка!..

— Вунь той грузавік? Не! Ён стары...

— Вунь той трамвай? Ды ніколі!

— Чаму?

— Бо ён — не ў наш бок.

...Гэта была ілюстрацыя да сумнай жаночай высновы: чакаць мужчыну, які вас не кахае, — тое ж, што карабель — у аэрапорце.

### На чужых памылках

Маладосць — дурносць: знаёмы падлетак нават у моцныя маразы хадзіў без шапкі. Маці ўгаворвала, бацька сварыўся — усё без толку: сын хварэў, лячыўся і зноў хварэў.

— У гэтым месяцы шмат грошай на лекі пайшло, — выпраўляючы ў школу пасля чарговай прастуды, сказала матуля. — Так што на кішэнныя расходы — прабач — ні капейкі не дам ні сёння, ні заўтра... Ды і наогул выбірай: альбо галава ў холадзе і вецер у кішэнях, альбо...

Да холаду сын неяк прыцярпеўся, да ветру — не.

**Валянціна ДОЎНАР.**

**АД ЯЕ Ж:** калі вас палохае ваш узрост, паспрабуйце перавесці яго ў долары, і вы зразумееце, што гэта зусім няшмат.

Сяргей КРАСНЫ:

# «РАК ТОЎСТАЙ КІШКІ ВЫХОДЗІЦЬ НА ПЕРШАЕ МЕСЦА,
## І ГЭТА МОЖНА ЗВЯЗАЦЬ З АСАБЛІВАСЦЯМІ ХАРЧАВАННЯ БЕЛАРУСАЎ»

**Летась у 56 тысяч беларусаў упершыню выявілі анкалагічныя захворванні, каля 17 тысяч пацыентаў са злаякаснымі пухлінамі памерла. У мужчын найчасцей выяўляюць рак прастаты, у жанчын — малочнай залозы. Таксама высокай застаецца захваральнасць на рак тоўстай кішкі, і гэтым наша краіна адрозніваецца ад астатніх развітых краін свету. Чым гэта тлумачаць анколагі? Чаму беларусы не жадаюць праходзіць скрынінгавыя абследаванні? Якія новыя магчымасці дыягностыкі і лячэння з'явіліся ў Беларусі і ў чым наша краіна апярэджвае многія іншыя? Пра гэта расказалі анколагі.**

### Каланаскапія дазваляе папярэдзіць да 80 % хвароб

Сусветная арганізацыя аховы здароўя прагназуе ў будучыні рост анкалагічных хвароб. Да 2050 года колькасць новых выпадкаў у свеце павялічыцца амаль у два разы. Як адзначыў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Сяргей КРАСНЫ,** Беларусь нічым не адрозніваецца ад развітых краін па эпідэміялогіі злаякасных пухлін. Колькасць новых выпадкаў у год у краіне вагаецца ў раёне 50 тысяч.

У дапандэмічным 2019 годзе было выяўлена 54,5 тысячы новых выпадкаў. Прычым штогод гэта лічба павялічвалася прыкладна на 1300.

— Калі б мы прагназавалі сітуацыю без эпідэміі COVID-19, то да 2023 года колькасць новых выпадкаў павінна была б дасягнуць 59—60 тысяч. Аднак у 2020 годзе адбылося рэзкае зніжэнне захваральнасці — амаль на 20 %, на 10 тысяч новых выпадкаў было выяўлена менш. Тое ж назіралася ў 2021 годзе. А ў 2022 гэта лічба пачала павялічвацца, было выяўлена 51,5 тысячы. У 2023 годзе выяўлена каля 56 тысяч новых выпадкаў, — прывёў лічбы Сяргей Красны. — Калі параўноўваць з папярэднімі гадамі — здавалася б, рэзкі рост, дадалося пяць тысяч за год. Насамрэч мы не дасягнулі прагназаваных паказчыкаў, бо не выйшлі з ямы зніжэння захваральнасці. Нагадаю, прагнозная лічба была каля 60 тысяч, а будзе 56. Хутчэй за ўсё ў наступным годзе мы дасягнём гэтых лічбаў, і далей пойдзе звычайнае павелічэнне анкалагічнай захваральнасці, якое назіралася апошнія 50 гадоў, — патлумачыў анколаг.

Смяротнасць ад злаякасных наватвораў падчас пандэміі COVID-19 таксама знізілася — на 6 %. Такую з'яву анколагі зафіксавалі ўпершыню за ўсю гісторыю назіранняў. Цяпер гэта лічба стабілізавалася, аднак у будучыні чакаецца невялікае павелічэнне смяротнасці. Але гэта не павелічэнне, а вяртанне да лічбаў суадносна захваральнасці. У Беларусі ў 2023 годзе памерла каля 17 тысяч анкалагічных пацыентаў, прыкладна такая ж лічба была і ў 2022 годзе.

У структуры захваральнасці ў мужчын на першым месцы знаходзіцца рак прастаты, на другім і трэцім — адпаведна рак лёгкага і каларэктальны рак (рак тоўстай кішкі). У жанчын на першым месцы — рак малочнай залозы, далей каларэктальны рак і розныя пухліны гінекалагічнай сферы.

— Калі браць усё насельніцтва, то на першае месца



выходзіць з вялікім адрывам каларэктальны рак. І гэтым мы сур'ёзна адрозніваемся ад усіх развітых краін свету. Гэта можна звязаць з асаблівасцямі харчавання беларусаў. У нас не прынята шмат есці агародніны і фруктаў, за агародніну прымаецца бульба, што не зусім правільна. Гэта, канешне, агародніна, але з пазіцый здаровага харчавання няма такой карысці ад бульбы, бо яна ўтрымлівае вялікую колькасць крухмалу. Акрамя таго, у беларусаў прынята шмат есці мясных прадуктаў, у прыватнасці чырвонага мяса, што таксама можа садзейнічаць развіццю пухлін тоўстай кішкі. Сюды трэба аднесці маларухомы лад жыцця і наяўнасць у рацыёне такіх прадуктаў, якія адносяцца да фастфуду. Гэта таксама вельмі шкодныя рэчы, якія могуць павялічваць верагоднасць захваральнасці на каларэктальны рак, — пералічыў прычыны Сяргей Красны.

Ён адзначыў, што на гэтым фоне ў Беларусі не бітаецца такая працэдура, як прафілактычная каланаскапія з выдаленнем паліпаў. У развітых краінах яна вельмі распаўсюджана, беларусы ж проста так на яе не хочуць ісці, бо працэдура непрыемная. Пры гэтым выкананне каланаскапіі з выдаленнем паліпаў прыводзіць да таго, што 80 % раку тоўстай кішкі можна папярэдзіць. Калі такіх працэдур будзе выконвацца больш, мяркуецца, што і захваральнасць будзе зніжацца.

Як адзначыў **галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага цэнтра Віктар КАНДРАТОВІЧ,** захваральнасць у Мінску паўтарае крывую па краіне. Калі падчас ковіду было яе зніжэнне, то па выніках 2023 года колькасць захварэлых пацыентаў зраўнялася з даковідным перыядам. У 2019 годзе ў Мінску захварэла 11 700 пацыентаў, у 2023 годзе —11 500 чалавек.

Па прычыне смяротнасці ў Мінску таксама на першае месца выйшаў каларэктальны рак. Захваральнасць на рак у Мінску сярод іншых рэгіёнаў самая высокая, але гэта тлумачыцца тым, што ўзровень дыягностыкі тут вышэйшы, як і яе даступнасць. Што датычыцца смяротнасці, то яна самая нізкая ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны.

Віктар Кандратовіч расказаў, што анкалагічная запушчанасць вагаецца ў межах 20 %. Калі параўноўваць з іншымі рэгіёнамі Беларусі, то гэта менш, з развітымі краінамі — прыкладна столькі ж.

З 2010 года ў Мінску былі ўкаранёны скрынінгавыя праграмы па чатырох лакалізацыях, якімі імкнуліся ахапіць паўмільёна насельніцтва. Гэта рак шыйкі маткі, каларэктальны рак, рак прастаты і малочнай залозы.

— Было выяўлена шмат праблем як з боку дыспансерызацыі, так і з боку пацыентаў, іх нежадання даходзіць да скрынінгу. Праблемы былі прааналізаваны, атрыманы вопыт дазволіў укараніць скрынінгавыя праграмы ў дыспансерызацыю, — дадаў Віктар Кандратовіч.

### Планавае лячэнне — у анкацэнтрах

Структура анкалагічнай службы ў Беларусі захавалася з савецкіх часоў. Гэта анкалагічныя цэнтры і дыспансеры, іх па некалькі ў кожнай вобласці. Усё планавае лячэнне анкалагічных пацыентаў ажыццяўляецца ў анкацэнтрах, і гэта, па меркаванні Сяргея Краснага, мае сваё вырашальнае значэнне.

— Праведзена даследаванне, якое паказала, што выжывальнасць пацыентаў, пралечаных у анкалагічных установах, на 20—30 % вышэйшая ў параўнанні з агульналячэбнай сеткай пры ўсіх роўных умовах — аднолькавых захворваннях і іх стадыях. І такая сітуацыя не толькі ў Беларусі, а ва ўсім свеце. Але ў нас сістэма выбудавана. Таму пры несупастаўляльна розных фінансавых затратах, калі ўзяць ЗША і Беларусь, выжывальнасць пацыентаў, прычым мы параўноўвалі па ўсіх формах злаякасных наватвораў, прыкладна на адным узроўні. Звязана гэта з тым, што пры непараўнальных памерах краін у нас анкалагічных цэнтраў 14, у ЗША — 30.

У анкалагічных цэнтрах сканцэнтраваны найлепшыя кадры, прычым усіх напрамкаў — хіміятэрапеўты, радыёлагі, хірургі, якія выбіраюць найлепшую тактыку лячэння і рэалізоўваюць яе. Акрамя таго, у анкацэнтрах канцэнтруецца самае перадавое абсталяванне, неабходнае для дыягностыкі і лячэння.

У Мінску анкалагічная служба прадстаўлена стацыянарам на 684 ложкі і сваёй палiклінікай пры цэнтры. Акрамя таго, у кожным раёне Мінска ў цэнтральнай паліклініцы працуе анколаг. Такім чынам даступнасць анкалагічнай дапамогі набліжаюць да пацыента.

Дарэчы, паліклініка пры стацыянарным анкацэнтры падлягае зносу. У сакавіку — пачатку красавіка гэтага года яна будзе цалкам знесена, а на яе месцы з'явіцца новы 8-павярховы будынак на 1,5 тысячы наведванняў у змену і адміністрацыйны памяшканні. Тэрміны будаўніцтва, якое пачнецца ў другой палове бягучага года, — 3-5 гадоў.

### Скрынінг па аналізе крыві

Апошнім часам РНПЦ анкалогіі вядзе сумесныя даследаванні з інстытутамі НАН Беларусі, і пэўныя вынікі сапраўды ўражваюць. У прыватнасці, у Беларусі з'явілася нямецкая тэхналогія па скрынінгу злаякасных пухлін на падставе аналізу крыві. Быў наладжаны працэс вытворчасці ўсіх неабходных рэактываў, праведзены клінічныя выпрабаванні, і айчынныя рэактывы паказалі высокую эфектыўнасць у адносінах дыягностыкі больш за 60 відаў раку. Па астатніх відах пакуль немагчыма яшчэ зрабіць заключэнне, бо яны сустракаюцца вельмі рэдка. Цяпер вядуцца папуляцыйныя даследаванні. Калі яны будуць эфектыўнымі, як і клінічныя выпрабаванні, то праграма будзе пашырана. Адметна, што на сёння такія папуляцыйныя даследаванні праводзяцца ўсяго ў дзвюх краінах свету — Германіі і Беларусі.

— Мяне вельмі радуе, што гэты працэс удалося давесці да лагічнага завяршэння. Паступова пашыраецца колькасць уключаных у даследаванне людзей. На сёння тры цэнтры выконваюць такія даследаванні, а забор крыві можна зрабіць у любым пункце краіны. Працуе 50 сертыфікаваных лабараторый, а падрыхтавана 120. Па меры неабходнасці іх колькасць будзе пашырацца. На сёння магутнасць складае да 100 тысяч чалавек у год, і калі мы ўбачым эфектыўнасць, то прааналізаваць трэба хоць бы тысяч 20—30, то гэта праграма будзе пашырацца. На сёння любы ахвотны можа паўдзельнічаць пакуль, на жаль, толькі на платнай аснове. Але каштуе гэта зусім нядорага, — расказаў Сяргей Красны.

Ёсць унікальныя вынікі і ў сумесных даследаваннях па лячэнні пацыентаў. Адно з іх датычыцца CAR-T-клетачнай тэрапіі. У ім удзельнічалі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава і РНПЦ дзіцячай анкалогіі і гематалогіі, а таксама Інстытут біяарганічнай хіміі НАН Беларусі.

— Размова ідзе пра тэхналогіі генетычнай мадыфікацыі Т-лімфацытаў, якія з дапамогай хімерных рэцэптараў маглі б усправымаць пэўныя клеткі злаякаснай пухліны. Размова ідзе пра CD 19 лімфомы. У даследаванні ўдзельнічалі пацыенты, у якіх праведзена вялікая колькасць хіміятэрапій і ў злаякаснай пухліны развілася рэзістэнтнасць (устойлівасць), а меркаваная працяглась іх жыцця не перавышае два месяцы. Дык вось выкананне ім CAR-Т-клетачнай тэрапіі (яна ў цяперашні час праведзена 25 пацыентам) дазволіла атрымаць эфект у 100 % выпадкаў, а ў 88 % адбылося поўнае вылечванне. Яшчэ раз падкрэслю, што размова ідзе пра пацыентаў, якім засталося жыць усяго два месяцы. Гэта ўнікальны вынік, — падкрэсліў Сяргей Красны, дадаўшы, што ў суседніх краінах пакуль такія тэхналогіі не выкарыстоўваюцца.

Да нас па такое лячэнне прыязджаюць пацыенты з Расіі. У іншых развітых краінах свету такая тэхналогія выкарыстоўваецца, але яе кошт на аднаго пацыента — ад 250 тысяч долараў да мільёна ў залежнасці ад краіны. У Беларусі яна каштуе 50 тысяч.

— Нельга сказаць, што гэты метад можна паставіць на паток. Вылечванне пацыентаў патрабуе знаходжання ў рэанімацыі, спецыяльнай кваліфікацыі анестэзіёлагаў, бо калі спазніцца на паўгадзіны з пэўнымі маніпуляцыямі — чалавека не выратуеш. Гэта складаная індывідуалізаваная тэхналогія, і для пашырэння яе выкарыстання неабходны арганізацыйныя мерапрыемствы, — адзначыў Сяргей Красны.

Сёння сумесна з Акадэміяй навук распрацоўваюцца некаторыя лекавыя прэпараты для лячэння анкалагічных пацыентаў. Навуковыя даследаванні праведзены, атрыманы высокі ўзровень эфектыўнасці, але з арганізацыяй вытворчасці пытанні пакуль не вырашаны. Мяркуецца, што гэта адбудзецца цягам паўгода-года.

Яшчэ адна сумесная распрацоўка з НАН — так званая вакцына супраць раку «Еленаген». Сяргей Красны паведаміў, што ў цяперашні час таксама вядуцца спробы арганізаваць яе выкарыстанне.

— Даследаванне па выкарыстанні прэпарату «Еленаген» скончылі толькі па адной злаякаснай пухліне — хіміярэзістэнтным раку яечнікаў. Вынікі на сёння прызнаны самымі высокімі ў сусветным маштабе. Улічваючы, што лекі скончыліся, даследаванне прыпынена, і мы чакаем, пакуль будзе наладжана вытворчасць. Спадзяёмся, што гэта адбудзецца сёлета. Гэта складаная генетычная канструкцыя, і наладзіць яе вытворчасць няпроста па дзвюх прычынах. Па-першае, сфарміраваць саму канструкцыю, па-другое, прыбраць усе дамешкі, так званыя эндатаксіны. У Расіі не змаглі гэтага зрабіць, спадзяёмся, у Беларусі атрымаецца. Магчыма, усё будзе беларускае, магчыма, з прыцягненнем тэхналогій іншых краін, аднак лекі гэтыя мы атрымаем, — упэўнены Сяргей Красны.

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Предмет аукциона – Лот:**
**капитальное строение с инвентарным номером 111/С-6550 (наименование: ремонтная мастерская; назначение: здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции)),**
площадью 1044,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, 6, 0,1 км юго-западнее д. Зубелевичи, на земельном участке с кадастровым номером 125081100001000054, площадью 0,1773 га, составные части и принадлежности: крыльца

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 104 350,42 | Размер задатка, руб. | 10 435,04 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Нача», Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Нача, ул. Советская, 16, тел./факс 80163352505. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, т/ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20% от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 04 марта 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 01 марта 2024 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВТОРЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Аукцион состоится **26.02.2024,**
начало: **10.00**, окончание: **16.00**
на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by.
Время приема заявок:
**с 14.02.2024 09.00 до 23.02.2024 г. 15.00**

**Организатор аукциона, оператор ЭТП:**
ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

**Продавец:** ООО «Металлстройпрофиль», 223058, Минская обл., Минский р-н, с/с Боровлянский, д. 62, каб. 55 (район д. Лесковка)

**Информация о предмете (10 изолированных помещений и 1 капитальное строение административного назначения), за исключением лота № 3 (инв. № 600/D-84156) и лота № 12 (инв. № 600/D-70974),**
и порядке проведения электронных торгов, в том числе об оформлении участия в торгах, определении лица, выигравшего торги, а также сведения о начальной и минимальной цене указаны в ранее опубликованном извещении о проведении публичных электронных торгов (аукциона) в газете «Звязда» № 252 от 28.12.2023 (300982), стр. 14, а также на сайте ЭТП iintorgi.by

Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by

УНП 291442411

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 017 516-80-61) по поручению **отдела культуры Молодечненского районного исполнительного комитета** (продавец, место нахождения: Минская область, г. Молодечно, ул. Виленская, 6, тел. 0176 77-16-32), проводит повторный открытый аукцион по продаже

### ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ с инв. № 630/D-45414

**(наименование: детская библиотека «Верасок»), общей площадью 864,1 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 121В-3.**

Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 642000000003000674, площадь – 0,1474 га (постоянное пользование, доля в праве – 57/100).

Начальная цена **– 391 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **39 100,00** бел. руб.

Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by, порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 15.12.2023.

Аукцион состоится **29.02.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.02.2024** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра 8 (0176) 52-91-76.**

УНН 601058195

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**(Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего**

### ОАО «Компания «МогНат»

Аукцион состоится **05.03.2024 в 11.00**
по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Лот № 1:**

**Капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – котельная**, пл. – 687,6 кв. м.
**Капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – мазутонасосная**, пл. – 41,0 кв. м.
**Капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – склад**, пл. – 44,2 кв. м.
**Емкость металлическая 80 м$^3$,** инв. № 5283.

Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64, 64В, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 (пл. – 0,4562 га).

Отдельный земельный участок под обслуживание лота № 1 не выделен.

***Начальная цена продажи: 79 020,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 7 902,00 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901.

Срок подачи документов для участия в аукционе: **по 04.03.2024 до 11.00.**

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **15 марта 2024 г. в 10.00**, (Минская область, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, д. 63), Богушевичский сельисполком, зал заседаний |
| **Продавец и его адрес** | Богушевичский сельский исполнительный комитет, Минская область, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, д. 63 |
| **Земельный участок (количество), размер, его кадастровый номер и адрес** | **Лот 1** – участок площадью 0,25 га, № 620480808301000042, д. Притерпа Березинского района Минской области; **Лот 2** – участок площадью 0,25 га, № 620480808301000041, д. Притерпа Березинского района Минской области; **Лот 3** – участок площадью 0,25 га, № 620480801101000089, д. Божино Березинского района Минской области |
| **Целевое назначение земельного участка** | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома) |
| **Начальная (стартовая) цена продажи** | **Лот 1** – 1 500,00 (одна тысяча пятьсот рублей); **Лот 2** – 1 500,00 (одна тысяча пятьсот рублей); **Лот 2** – 2 000,00 (две тысячи рублей) |

**С дополнительной информацией можно ознакомиться в извещении** о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность, размещенном на официальных сайтах: Минского областного исполнительного комитета (minsk-region.gov.by), Минского городского исполнительного комитета (minsk.gov.by), Березинского районного исполнительного комитета (berezino.minsk-region.gov.by) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (gki.gov.by, au.nca.by).

УНН 600036587

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ НА 15 %

Организатор аукциона:
**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»,** г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2.9.
Продавец: **открытое акционерное общество «Гомельторгмаш»,** г. Гомель, ул. Владимирова, 14 – в лице управляющего Насонова В.В.

Торги состоятся **29 февраля 2024 года** в 11.00
по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2.9.

Подробный перечень имущества в количестве 6 лотов, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 26.10.2023 г.
Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 14.02.2024 по 27.02.2024 с 9.00 до 16.00.
Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: 8 (0232) 50-67-86, Юлия Дмитриевна; 8 (0232) 50-63-96, Людмила Петровна.

Контактные данные организатора аукциона:
**8 (0232) 23-23-54, 8 (044) 599-18-16.**

УНП 400071204

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375212 24-63-12, +37529 510-07-63.

**Продавец**: открытое акционерное общество «Витязь», 210605, г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, тел. +375 212 26-52-13.

**Лот № 1.** Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86269 площадью – 449,5 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/1, составные части и принадлежности: две пристройки, готовность строения – 42 %, готовность двух пристроек – 62 %, расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000003000151 (право аренды).
**Нач. цена: 14 564,03 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 1456,40 бел. руб.**

**Лот № 2.** Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86271 площадью – 288,6 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/3, составные части и принадлежности: крыльцо, готовность строения – 68 %, готовность крыльца – 100 %, расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000003000151 (право аренды).
**Нач. цена: 15 311,51 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 1531,15 бел. руб.**

**Лот № 3.** Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 200/U-86273, площадью – 4722,8 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б/2, готовность строения – 39 %, расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000003000151 (право аренды).
**Нач. цена: 148 824,41 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 14 882,44 бел. руб.**

**Лот № 4.** Незавершенное законсервированное капитальное строение инв. № 200/U-86266, площадью – 1296,1 кв. м., назначение – здание неустановленного назначения, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б, составные части и принадлежности: пристройка, навес, готовность строения – 47 %, готовность пристройки – 52 %, готовность навеса – 74 %, расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000003000151 (право аренды).
**Нач. цена: 74 398,36 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 7439,83 бел. руб.**

Информация о зем. участке с кадастровым № 240100000003000151: зем. участок площадью 3,9294 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тр-т Старобабиновичский, 17Б, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания автотранспортного предприятия. Зем. участок предоставлен продавцу на праве аренды. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Обременение по лотам №№ 1–4:** запрещение совершения регистрационных действий. Письмо УПИ ГУЮ Витебского облисполкома от 04.07.2022 № 20122/29366: запрет на совершение регистрационных действий будет снят при условии перечисления покупателем денежных средств за приобретенный предмет аукциона на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 14.03.2024 в 12.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

Срок внесения задатков и приема документов: **с 15.02.2024 с 08.30 по 13.03.2024 до 17.30.**

**Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901.**

Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 16.11.2022, 04.02.2023, 17.03.2023, 08.04.2023, 23.05.2023, 12.10.2023. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия повторного аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона; расходы Продавца на проведение независимой оценки, подписать договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи предмета аукциона.

**Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Указом Президента Республики Беларусь № 232 от 05.05.2009 г. «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Положением «О порядке организации и проведении торгов по реализации имущества ОАО «Витязь» от 13.04.2021.**

Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375 (212) 24-63-12, +37529 510-07-63,** e-mail: **vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. 8-0212-265383.